ЧЫМ ЗДЗІВІЎ ФЕСТЫВАЛЬ НАВУКІ 5





ЯК УДАСКАНАЛЯЦЬ ГАНДАЛЬ У РУЖАНАХ 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ВЕРАСНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 172 (30052)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## КОРАТКА

- Мінэканомікі: узровень дзелавой актыўнасці за 7 месяцаў вырас больш як на 20 працэнтаў.
- **Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ў 99 раёнах Беларусі.**
- Каля 10 тысяч удзельнікаў з 16 краін ужо зарэгістраваліся на Мінскі паўмарафон.
- **Зборы з ваеннаабавязанымі тэрытарыяльных войскаў стартавалі ў Магілёўскай вобласці.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў:**

*«Тое, што адбываецца на нашых рубяжах, ужо не проста дэманстрацыя сілы, а адкрытыя ваенныя падрыхтоўкі. Да граніц Беларусі і Расіі пастаянна сцягваюцца новыя войскі і ваенная тэхніка, праводзіцца ўсё больш вучэнняў яўна не абарончага характару. Цалкам відавочна, што ў такіх умовах Рэспубліка Беларусь проста абавязаная прымаць усе магчымыя меры, каб пацвердзіць свой статус донара бяспекі ў рэгіёне і абараніць сваіх грамадзян. У гэтых мэтах была ўзмоцнена беларуска-расійская групоўка войскаў. Прынятыя рашэнні аб размяшчэнні ў нас тактычнай ядзернай зброі і стварэнні беларуска-расійскіх вучэбна-баявых цэнтраў сумеснай падрыхтоўкі ваеннаслужачых».*

З першых вуснаў

# «НЯМАЛА ЗРОБЛЕНА, АЛЕ ЁСЦЬ КУДЫ ІМКНУЦЦА»

## Прэзідэнт расказаў аб супрацоўніцтве з Узбекістанам

**У адносінах Беларусі з Узбекістанам нямала зроблена, але ёсць куды імкнуцца. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са Старшынёй Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзілой Нарбаевай.**

Прэзідэнт заўважыў, што візіт узбекскай дэлегацыі ў Беларусь праходзіць у гістарычны перыяд — 30-годдзя ўстанаўлення беларуска-ўзбекскіх адносін. Па словах беларускага лідара, Узбекістан ніколі не адмаўляў Беларусі ў дапамозе. «А беларусы такія людзі, што ў даўгу ніколі не застаюцца. Усё, чым мы можам дапамагчы Узбекістану, мы зробім», — запэўніў ён. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь гатовая развіваць адносіны і дзяліцца любымі тэхналогіямі.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што візіт парламенцкай дэлегацыі Узбекістана ў Мінск праходзіць пасля важных унутрыпалітычных падзей, якія адбыліся там, — канстытуцыйнага рэферэндуму і датэрміновых выбараў прэзідэнта. «Малайцы. Акуратна. Былі непаладкі нейкія напярэдадні, вы своечасова прыгожа адрэагавалі. Людзі на вас не пакрыўджаныя. Нашы назіральнікі там былі і бачылі, што ўсё было дастойна, вы малайцы ў гэтым плане. Нам гэта важна, таму што мы таксама ўдасканальваем свой Асноўны Закон, заканадаўства аб выбарах», — сказаў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што ў хуткім часе ў Беларусі пройдуць выбары, адзіны дзень галасавання, стаіць задача сфарміраваць не толькі парламент, але і вышэйшы



Фота БелТА.

прадстаўнічы орган народаўладдзя — Усебеларускі народны сход. Таму Беларусі цікавы нядаўні вопыт правядзення электаральных кампаній ва Узбекістане. «Для нас ваша парада, на што звярнуць увагу ў цяперашняй сітуацыі, вельмі важная», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана на палях міжнародных арганізацый і рэгіянальных аб'яднанняў. Кіраўнік краіны выказаў удзячнасць за падтрымку ў пытанні паскоранага атрымання Беларуссю членства ў ШАС. «Мы вас заўсёды будзем падтрымліваць, таму што ваш курс наміралюбнасць, на дружалюбныя адносіны з суседзямі і іншымі краінамі — гэта і наш курс», — адзначыў ён.

СТАР. 2

Жніво-2023

# АГРАРЫІ ПЛАНУЮЦЬ АТРЫМАЦЬ КАЛЯ 9 МІЛЬЁНАЎ ТОН ЗБОЖЖА

**Вось і падыходзіць да канца жніво. У нашай краіне ўбрана больш за 97,5 % збожжавых палеткаў. З іх больш за 98 % збожжавых каласавых і зернебабовых і звыш 94 % рапсу, паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Уладзімір ГРАКУН. Напярэдзе масавая ўборка кукурузы, бульбы і цукровых буракоў.**



Усяго намалочана каля 7 мільёнаў 58 тысяч тон збожжавых і бабовых культур, уключаючы рапс. З гэтага аб'ёму збожжавыя каласавыя і зернебабовыя складаюць 6 мільёнаў 91 тысячу тон, алеянасенне — 967 тысяч тон. Па словах намесніка міністра, цяпер актыўна ідзе ўборка грэчкі і проса. Гэтых культур ужо намалочана, адпаведна, 11,6 тысячы тон і 8,45 тысячы тон. Працягваюцца работы па ўборцы льнотрасты, якой ужо нарыхтавана 67 тысяч тон. Салома на скошаных палях збожжавых каласавых і зернебабовых культур убрана на 70,5% іх плошчы.

СТАР. 2

Бяспека

# РАТАВАЛЬНЫЯ АПЕРАЦЫІ НЕ МАЮЦЬ НІ МЕЖ, НІ ТЭРЫТОРЫЙ



**Пад старшынствам Рэспублікі Беларусь у Мінску адбылася 14-е пасяджэнне Каардынацыйнага савета па надзвычайных сітуацыях АДКБ з удзелам кіраўнікоў ратавальных ведамстваў. Быў абмеркаваны шырокі спектр пытанняў, накіраваных на ўмацаванне механізмаў узаемадзеяння па пытаннях папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый пад эгідай Арганізацыі.**

У рамках старшынства міністра Вадзіма Сіняўскага у Каардынацыйным савеце ў 2023 годзе беларускі бок прадставіў інфармацыю аб эфектыўнасці рэалізацыі рашэнняў, прынятых у ходзе 13-га пасяджэння, а таксама асноўныя вынікі дзейнасці савета за справаздачны перыяд. Удзельнікі падвялі вынікі спецыяльнага вучэння ратавальных падраздзяленняў дзяржаў — членаў АДКБ «Скала-2023», вучэння «Бяспечная Арктыка — 2023», а таксама абмеркавалі план сумесных мерапрыемстваў на будучы год.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
23172

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!
Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «НЯМАЛА ЗРОБЛЕНА, АЛЕ ЁСЦЬ КУДЫ ІМКНУЦЦА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кажучы пра Першы беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум, Прэзідэнт заўважыў, што прыйшоў час пераходзіць да рэгіянальнага супрацоўніцтва. Такі вопыт ужо ёсць і кожны год прымяняецца падчас беларуска-расійскага форуму рэгіёнаў. «Я вельмі хацеў бы, каб мы перайшлі да рэгіянальнага супрацоўніцтва, асновай якога з'яўляецца эканоміка. Для нас гэта важна. Для Узбекістана яшчэ важней з пункту гледжання тэхналогій. У гэтым плане, пачынаючы ўжо не з простага гандлю, а з кааперацыі нашых прадпрыемстваў, пераносу нашых тэхналогій да вас ва Узбекістан, для вас гэта было б вельмі цікава. Мы гатовыя ў такім кірунку абсалютна адкрыта працаваць. Вопыт пэўны ёсць, тэхналогіі ёсць, мы гатовыя абменьвацца гэтымі тэхналогіямі. Вельмі хацелася б больш цесна супрацоўнічаць з Узбекістанам, таму што ў вас ёсць шмат тавараў, якія нас цікавяць і якія нам карысныя», — сказаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі і ўзбекскі народы вельмі падобныя ў галоўным — гэта вельмі працавітыя людзі, якія адчулі ў сваёй гісторыі «ўсё, што можна было адчуць». Кіраўнік дзяржавы расказаў, што доўгі час уважліва, пільна назірае за развіццём Узбекістана і лічыць, што з цяперашнім кіраўніком — Прэзідэнтам Шаўкатам Мірзіёевым — народу пашанцавала. «У вас вельмі добры Прэзідэнт. Я і ў вочы яму кажу: ты не павінен падвесці народ, які табе так давярае і верыць», — сказаў ён. — Пашанцавала ў тым плане, што ён горача хоча зрабіць для Узбекістана і ўзбекаў жыццё лепшым. Ва Узбекістана вялікая будучыня. І мая вам парада: пастарайцеся як мага даўжэй зберагчы свайго Прэзідэнта. Яму патрэбны час, каб разгарнуцца», — параіў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар расказаў, што неаднойчы бываў ва Узбекістане, прызнаўся, што яго ўразіла прырода гэтай краіны. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, яму таксама хацелася б наведаць Узбекістан зімой. «Я пастараюся вырвацца ў найбліжэйшы час, каб пабываць у вас у гарах», — адзначыў ён.

У слове ў адказ Танзіла Нарбаева падзякавала беларускаму лідару за цёплы і гасцінны прыём. Яна заўважыла, што беларускі і ўзбекскі народы яднае таксама адкрытасць і гасціннасць. «Мы, як толькі ступілі на беларускую зямлю, адчулі сябе як дома. Захопленыя чысцінёй, акуратнасцю і дарог, і гарадоў, добразычлівасцю людзей. Вы правільна сказалі, што нашы народы збліжаюць працавітасць, гасціннасць, адкрытасць. Мы пабывалі ў першы дзень на некалькіх аб'ектах і адчулі адкрытасць, цікавасць да гасцей у беларускага народа і вельмі гэтаму рады», — сказала яна. Танзіла Нарбаева перадала Аляксандру Лукашэнку прывітанне і цёплыя пажаданні ад Прэзідэнта Узбекістана Шаўката Мірзіёева.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**❍ У тэму**

## БЕЛАРУСЬ І УЗБЕКІСТАН ЗА ПЯЦЬ ГАДОЎ НАРАСЦІЛІ ТАВАРААБАРОТ ПРАКТЫЧНА Ў ТРЫ РАЗЫ

**Аб гэтым заявіў Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас сустрэчы са Старшынёй Сената Олій Мажліса Узбекістана Танзілой НАРБАЕВАЙ, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Для нас Узбекістан — ключавы партнёр у Цэнтральнай Азіі. Мы вельмі рады таму, што ўстанавіліся вельмі цёплыя адносіны на ўсіх узроўнях — на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, урадаў, на міжпарламенцкім узроўні. Цяпер вельмі добры момант, каб кінуць погляд у мінулае і намеціць планы на будучыню ў святле таго, што мы адзначаем 30-годдзе дыпламатычных адносін у гэтым годзе. Нашы двухбаковыя адносіны перажываюць перыяд своеасаблівага росквіту. Пра гэта сведчыць і вельмі плённы палітычны дыялог, і ўзаемная падтрымка на міжнароднай арэне, што вельмі важна ў бягучых умовах, а таксама ўзаемны гандаль і ў цэлым гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. За пяць гадоў мы нарасцілі тавараабарот практычна ў тры разы. Гэта вельмі сур'ёзны паказчык. І бягучы год не выключэнне — мы практычна на 50 працэнтаў прыбавілі», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Ён адзначыў, што Беларусь поўнасцю кампенсавала страты ад санкцый за кошт нарошчвання супрацоўніцтва з дружалюбнымі краінамі. «І Узбекістан у гэтым шэрагу займае дастойнае месца. Мы дзякуем за ўзважаны і канструктыўны партнёрскі падыход», — дадаў прэм'ер-міністр.

Танзіла Нарбаева таксама адзначыла, што адносіны Беларусі і Узбекістана актывізаваліся, і гэтаму задаюць тон кіраўнікі дзяржаў. «Важна забяспечваць прававую аснову для рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на вышэйшым узроўні, таму парламенцкае вымярэнне так важна. Трэба гарманізаваць нашы заканадаўствы, забяспечваць парламенцкі кантроль за рэалізацыяй дамоўленасцяў. Немалаважныя для нас і рэгіянальнае супрацоўніцтва, і сацыяльны кірунак. У прыярытэце эканоміка, ёсць патэнцыял для павелічэння тавараабароту», — зрабіла акцэнт яна.

# АГРАРЫІ ПЛАНУЮЦЬ АТРЫМАЦЬ КАЛЯ 9 МІЛЬЁНАЎ ТОН ЗБОЖЖА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наперадзе ўборка кукурузы на зерне, якая папоўніць агульны каравай. Усяго каля 247 тысяч гектараў плошчаў адведзена абласцям для ўборкі гэтай культуры. Ужо цяпер вядомая папярэдняя ўраджайнасць гэтага збожжа, якая дазваляе разлічваць на агульны вал у аб'ёме 1 мільён 700 тысяч тон. Яшчэ засталося ўбраць яравы рапс. Таму спецыялісты Мінсельгасхарча разлічваюць атрымаць сумарны збор збожжавых і зернебабовых плюс кукурузы і рапсу каля 9 мільёнаў тон збожжа ў засекі.

## ДЗЯРЖЗАКАЗ БУДЗЕ ВЫКАНАНЫ Ў ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ

Паралельна з завяршэннем уборкі збожжавых у нашай краіне ажыццяўляецца здача збожжа дзяржаве. Па харчовым зерні гэты паказчык здачы выкананы на 89 %, па рапсе — 91 % і 63 % — па піваварным ячмені. Цяпер астатняе зерне дапрацоўваецца і ў поўным аб'ёме будзе пастаўлена па дзяржзаказе. Намеснік міністра ўпэўнены ў тым, што аграрыі цалкам забяспечаць сыравінай перапрацоўчыя камбінаты хлебапрадуктаў, піваварныя заводы, патрэбы па вырабе спірту. Акрамя таго, каля 840 тысяч тон збожжа запланавана захаваць у якасці насеннага фонду. Больш за 5 мільёнаў тон фуражнага збожжа будзе пастаўлена для кармлення грамадскага пагалоўя жывёлы.

Цяпер гаспадаркі актыўна капаюць бульбу. Сабрана 58,3 тысячы тон клубняў. Сярэдняя ўраджайнасць — 367,7 цэнтнера з гектара. Пачата ўборка кукурузы на сілас. Сабрана 2 мільёны 695 тысяч тон зялёнай масы кукурузы. У краіне пачалі ўборку цукровых буракоў. Накапана 99 тысяч тон караняплодаў. Ураджайнасць пакуль складае 468,3 цэнтнера з гектара.

## НАПЕРАДЗЕ ГРОДЗЕНСКІ РАЁН

Уладзімір Гракун адзначыў, што папярэднія вынікі паказваюць: лідарам уборачнай кампаніі з'яўляецца Гродзенскі раён, які намалаціў 243 тысячы тон збожжа з ураджайнасцю 84,2 цэнтнера з гектара. На другім месцы — Нясвіжскі раён з ураджайнасцю ў 74 цэнтнеры з гектара. Усяго 12 раёнаў намалацілі больш за 100 тысяч тон збожжа.

Пяць раёнаў Гомельшчыны прыступілі да ўборкі кукурузы на зерне, паведаміў **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый ШЫНКАРЭНКА**. Ужо вядуць гэтыя работы аграрыі Мазырскага, Нараўлянскага, Калінкавіцкага, Ельскага і Добрушскага раёнаў вобласці. З запланаваных больш за 70 тысяч гектараў убрана 577 гектараў. Намалочана 3,6 тысячы тон збожжа з сярэдняй ураджайнасцю 63,1 ц/га.

«Актуальнае пытанне — уборка кукурузы на сілас. Паводле звестак на 5 верасня, убрана 43,8 тысячы гектараў кукурузы на сілас. Гэта 20 % ад плана», — распавёў Дзмітрый Шынкарэнка. Паводле яго слоў, сярэдняя ўраджайнасць зялёнай масы складае 237 ц/га. У Рэчыцкім раёне гэтая лічба вышэйшая — больш за 300 ц/га. Атрыманая зялёная маса ідзе на кармленне пагалоўя, на нарыхтоўку сіласу. Яго ўжо атрымалі 807 тысяч тон, або 25 % ад плана. Усяго ж у рэгіёне нарыхтавалі 13,8 цэнтнера кармавых адзінак на адну ўмоўную галаву, дадаў Дзмітрый Шынкарэнка. Гэта на 1,54 цэнтнера кармавых адзінак вышэй за леташні ўзровень.

## ЗБОЖЖА ХОПІЦЬ УСІМ

«Гэты год экстрэмальны і засушлівы, але спецыялісты праявілі сябе як сапраўдныя прафесіяналы і не дапусцілі моцнай страты ўраджайнасці. Хацелася б сказаць усім працаўнікам вёскі вялікі дзякуй за працу і пажадаць у далейшым не ўпускаць, а толькі прырастаць да тых вынікаў, якія мы сёння маем», — падсумаваў Уладзімір Гракун.

У Мінсельгасхарчы запэўнілі: выпрацаванага збожжа дастаткова, каб забяспечыць унутраныя патрэбы. Так, летась валавы збор алеянасення склаў 805 тысяч тон. У гэтым сезоне ён набліжаецца да 970 тысяч. Па ўсіх абласцях ураджайнасць гэтай культуры вышэйшая за леташнюю. На руку аграрыям кан'юнктура сусветнага рынку. Сярэдняе значэнне індэкса сусветных цэн харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН на раслінныя алеі толькі ў ліпені павялічылася на 12,1 % у параўнанні з мінулым месяцам. Экспарт беларускага рапсавага алею прынясе дадатковы прыбытак і далейшае ўмацаванне эканомікі АПК.

Намеснік міністра адзначыў, што самае галоўнае, на што звяртаем увагу цяпер, — гэта нарыхтоўка кармоў. «Мы прыступілі да ўборкі кукурузы. Паралельна ўбіраем і шматгадовыя травы, якія сёння падышлі да трэцяга ўкосу. У цэлым мы павінны больш за 30 цэнтнераў кармавых адзінак нарыхтаваць на адну ўмоўную галаву. Дадзеныя аб'ёмы пралічваюцца. Самае галоўнае — на месцах не ўпусціць час і ўбраць усё, што ў нас яшчэ ёсць».

І яшчэ. Сёлета ў Беларусі пасеяна 115 тысяч гектараў бабовых культур. У будучую пасяўную іх плануецца павялічыць да 240 тысяч гектараў, а да 2025 года — да 350 тысяч гектараў. «Мільён тон бабовых культур мы павінны ў выніку атрымліваць для забеспячэння жывёлагадоўчай галіны бялком», — адзначыў Уладзімір Гракун.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі стварылі спецыяльную ўстанову для развіцця прыватнага сектара эканомікі



Улады Кітая сфарміравалі Упраўленне па развіцці прыватнага сектара эканомікі пры Дзяржаўным камітэце па справах развіцця і рэформах (NDRC). Аб гэтым паведаміла інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа». Упраўленне створана для ўмацавання каардынавання палітыкі ў профільных абласцях і забеспячэння максімальна хуткай рэалізацыі адпаведных мер з дасягненнем адчувальных вынікаў, прыводзіць агенцтва словы віцэ-старшыні NDRC Цун Ляна. Асноўныя задачы новага органа ўключаюць маніторынг, вывучэнне і аналіз развіцця прыватнага сектара эканомікі, каардынаванне і арганізацыю фармулявання палітыкі і мер стымулявання яго развіцця, а таксама фармуляванне палітыкі стымулявання росту прыватных інвестыцый. Акрамя таго, упраўленне будзе несці адказнасць за фарміраванне механізму рэгулярнага абмену інфармацыяй з прыватнымі прадпрыемствамі, каардынаванне намаганняў па вырашэнні важных праблем, звязаных з развіццём прыватнага сектара, і работу па павышэнні яго канкурэнтаздольнасці на міжнароднай арэне.

### У Тайландзе члены новага ўрада прынялі прысягу на вернасць каралю Раме X



Члены новага ўрада Тайланда на чале з прэм'ер-міністрам Сетхай Тхавісінам прынялі прысягу на вернасць каралю Маха Вачыралонгкорну (Раме X). Урачыстая цырымонія адбылася ў каралеўскім палацы Дусіт у цэнтры Бангкока. Пра гэта са спасылкай на тэлеканал Thai PBS паведаміла ТАСС. З моманту прыняцця прысягі ўсе 34 члены тайландскага кабінета міністраў афіцыйна ўступілі ў свае пасады. Пасля заканчэння цырымоніі ў афіцыйнай рэзідэнцыі прэм'ера Тхавісін заявіў, што прамова караля стане кіраўніцтвам для далейшай работы прызначанага ўрада. «Гатовы пацвердзіць, што гэты ўрад з'яўляецца народным, а міністры, якія ўваходзяць у яго склад, закліканы прадстаўляць інтарэсы народа», — сказаў ён. Наступным крокам новага ўрада Тайланда стане абнародаванне ў парламенце яго праграмы, якую прэм'ер-міністр прадставіць 11 верасня.

### Кіраўнік OpenAI першым атрымаў «залатую візу» Інданэзіі

Гендырэктар кампаніі OpenAI (якая летась прадставіла сэрвіс ChatGPT ) Сэм Альтман першым атрымаў «залатую візу» ў Інданэзію тэрмінам на 10 гадоў. Пра гэта паведаміла агенцтва Bloomberg са спасылкай на мясцовыя ўлады. Па словах кіраўніка іміграцыйнай службы Інданэзіі Сільмі Карыма, такое рашэнне выклікана тым, што Альтман «вядомы па ўсім свеце і можа прынесці карысць Інданэзіі». Акрамя доўгага тэрміну знаходжання ў краіне, уладальніку такой візы будзе дазволена спрошчаная працэдура ўезду і выезду. Днямі газета The Jakarta Post паведаміла, што ў Інданэзіі ўводзіцца сістэма «залатых віз» для прыцягнення замежных індывідуальных і карпаратыўных інвестараў у мэтах стымулявання нацыянальнай эканомікі. Такі дакумент можна атрымаць на тэрмін ад 5 да 10 гадоў. Пяцігадовая віза патрабуе ад індывідуальных інвестараў стварэння кампаніі коштам $2,5 млн, для дзесяцігадовай неабходныя інвестыцыі ў памеры $ 5 млн. Карпаратыўныя інвестары павінны інвеставаць $25 млн для пяцігадовай візы і $50 млн — для дзесяцігадовай.

Мясцовы час

# Лічыцца сельскагаспадарчым, стане прамысловым

## Чым зараз жыве Любаншчына

**Любань — самы паўднёвы горад Мінскай вобласці, размешчаны на рацэ Арэса за 152 кіламетраў на поўдзень ад Мінска. Сёння ў ім пражывае 11,5 тысячы чалавек, сельскага насельніцтва ў раёне — 15,3 тысячы. Раён невялікі, але актыўна развіваецца. Больш падрабязна пра гэта распавёў старшыня Любанскага раённага выканаўчага камітэта Валерый МЕЛЬНІК. Гаворка, вядома, пачалася з уборачнай.**



***— Калі падсумаваць цяперашнюю ўборачную кампанію, наколькі ўдалося рэалізаваць намечанае?***

— У гэтым годзе, на жаль, не дасягнулі планавых паказчыкаў, таму што спачатку была складаная зіма з раннімі замаразкамі. Потым, з канца красавіка да чэрвеня, не было ападкаў — амаль 43 дні без дажджоў. Яны прыйшлі толькі ў другой палове ліпеня — занадта позна для раслін.

Мы завяршылі ўборку збожжавых. Намалацілі амаль 45 тысяч тон.

З улікам умоў надвор'я апошніх гадоў будзем рабіць стаўку на азімыя культуры, бо яравыя пакутуюць ад засухі. Азімыя лепш выходзяць з зімоўкі.

***— Як у цэлым справы на вёсцы?***

— Па даручэнні Прэзідэнта працягваецца будаўніцтва сучасных сельгаскомплексаў. Любанскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм аказвае вялікую дапамогу сельгасарганізацыям. У нас сёння 70 працэнтаў раёна — меліяраваныя землі. Гэта ў асноўным тарфянікі.

Любанскае райспажыўтаварыства — адно з найлепшых у сістэме спажыўкааперацыі Мінскай вобласці па эканамічных складніках. Да яго далучылі старадарожскае і частку салігорскага райпо.

У нас ёсць свой каледж, у якім навучаюцца спецыялісты сярэдняга звяна. Выпускнікі атрымліваюць пасведчанні трактарыста, машыніста, повара. Мы таксама рыхтуем слесараў, токараў, якія могуць ісці працаваць на прамысловыя прадпрыемствы. Варта адзначыць, што да нас едуць вучыцца хлопцы і з іншых рэгіёнаў.

На тэрыторыі раёна знаходзіцца Любанскі філіял ААТ «Слуцкі сыраробчы завод» па вытворчасці сыроў. Там вырабляецца элітная прадукцыя, да 90 працэнтаў якой паступае на экспарт.

***— Адной з галоўных задач органаў мясцовай улады з'яўляецца павышэнне якасці жыцця людзей. А гэта немагчыма зрабіць без развіцця сацыяльнай інфраструктуры. Што ў Любанскім раёне робіцца ў гэтым кірунку?***

— Летась дзяржава аказала дапамогу па будаўніцтве дзіцячага садка на 150 месцаў з басейнам, спецкласамі па вывучэнні пажарнай бяспекі, дарожнага руху, па развіцці каардынацыі, ёсць матэматычны і гістарычны класы, магчымасці авалодаць камп'ютарнай тэхнікай. На сёння садок цалкам запоўнены.

Плануем будаваць жыллё для працаўнікоў горна-абагачальнага комплексу, які з'явіцца на Любаншчыне ў выніку рэалізацыі інвестпраекта. Раён пакуль лічыцца сельскагаспадарчым, але з увядзеннем ГАКа стане прамысловым. Гэта бачым у перспектыве.

Цяпер будуем дарогі, мяняем асфальт, рамантуем інжынерныя сеткі. Летась адкрылі тры спартыўныя пляцоўкі. Адна з іх — унутрыдваровая для ўсіх ахвотных са штучным пакрыццём для гульні ў баскетбол, другая — міні-футбольная на базе каледжа, таксама варкаўт-пляцоўка. Таксама рэканструюем вясковыя школы: дзесьці замяняем дах, дзесьці фарбуем фасады.

***— Валерый Віктаравіч, а як развіваецца сістэма аховы здароўя? Як замацоўваеце спецыялістаў у гэтай сферы?***

— Па даручэнні Прэзідэнта рэканструюем на сяле ФАПы, амбулаторыі і ўчастковыя бальніцы. На 99 працэнтаў задача выканана. Таксама ў нас ёсць перасоўны ФАП. Спектр аказання медыцынскіх паслуг тут большы, бо ёсць магчымасць узяць аналізы на месцы. Да таго ж лекар выязджае па графіку. Людзі запісваюцца, як правіла, калі не могуць дабрацца па тых ці іншых прычынах да бальніцы.

У нас нядрэннае хірургічнае аддзяленне пры Цэнтральнай раённай бальніцы. Нядаўна ў сферу аховы здароўя прыйшлі 18 маладых спецыялістаў. Гэта выпускнікі медыцынскіх ВНУ і каледжаў. Штогод улады раёна праводзяць сустрэчы з маладымі спецыялістамі. Нядаўна з медработнікамі абмяркоўвалася тэма жылля. Мы забяспечваем кватэрамі медыкаў, якія прапрацавалі больш за два гады. У нас ёсць разуменне і поўнае ўзаемадзеянне з аблвыканкамам па вырашэнні гэтага пытання. Сёлета для работнікаў медыцынскай сферы і адукацыі будуем арэнднае жыллё. У першую чаргу засяляем сем'і, якія застаюцца ў раёне.

Недахоп медработнікаў яшчэ мае месца быць, але наша жыллёвая палітыка дазваляе вырашаць гэту праблему. Я думаю, што далей пры такой дынаміцы работы пытанне з кадрамі будзе вырашана.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Любанскага райвыканкама.**

Круглы стол

# АСЭНСАВАЦЬ МІНУЛАЕ, КАБ НАТХНІЦЦА НА БУДУЧЫНЮ

**Напярэдадні Дня народнага адзінства, якое ў краіне адзначаецца 17 верасня, у Доме літаратараў адбыўся круглы стол «Шляхі вялікіх выпрабаванняў». Арганізатарамі размовы сталі Саюз пісьменнікаў Беларусі, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Інстытут літаратуразнаўства імя Я. Купалы НАН Беларусі. Мерапрыемства прайшло з удзелам цэлага шэрагу пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў, гісторыкаў і мовазнаўцаў.**

У ходзе абмеркавання закранулі вытокі свята Дня народнага адзінства, вопыт мастацкай, выхаваўчай работы, інфармаванне грамадства, чытача пра паднявольнае жыццё беларусаў у панскай Польшчы да 1939 года, пра адстойванне нашымі продкамі грамадскіх, нацыянальных, палітычных інтарэсаў, а таксама звярнулі ўвагу на ўшанаванне літаратурнай спадчыны беларускіх пісьменнікаў, якія працавалі ў Заходняй Беларусі ва ўмовах польскай акупацыі (Максім Танк, Піліп Пестрак, Міхась Васілёк, Валянцін Таўлай і іншыя).

— У фармаце нашай работы 17 верасня мае тое значэнне, якое яму пачалі надаваць асабліва ў апошнія гады, яно накладвае на нас пэўны сацыяльны, грамадска-палітычны і, безумоўна, творчы абавязак. Калі меркаваць па памкненнях літаратараў, якія хацелі б нешта сказаць і ў дачыненні да гістарычных фактаў, і да самога асэнсавання гэтай даты, то крокі заўважныя. Мы чытаем новыя вершы на старонках перыядычных выданняў. Так ці інакш дадзеная тэма адлюстроўваецца ў калектыўных зборніках. Напрыклад, гарадзенцам блізкая такая тэма, бо з іх прашчурамі, землякамі тыя падзеі адбываліся, і тое магло б знайсці адлюстраванне ў паэтычнай, празаічнай, публіцыстычнай творчасці, — адзначыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**. — Мне здаецца, што гэтае свята, гэтая дата — яна яшчэ да многага абавязвае і нашы айчынныя кніжныя выдавецтвы. Ведаю, што ў «Мастацкай літаратуры» выйшла кніга ў серыі «100 вершаў», а мы, у сваю чаргу, у рамках праекта «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» выдалі кнігу «17 верасня. Дзень народнага адзінства», дзе змешчаны не толькі артэфакты і рэпрадукцыі старых паштовак, але пададзены і копіі заходнебеларускіх газет, якія выходзілі ў той час. Там ёсць самыя розныя ілюстрацыі, якія паказваюць людзей не проста ва ўмовах іх пражывання, але можна прасачыць і сам працэс уз'яднання Заходняй і Савецкай Беларусі.

Сапраўдный падзеяй стаў для беларусаў дзень 17 верасня 1939 года. А да гэтага ў Заходняй Беларусі адбывалася ўсякае — немагчымасць друкавацца, шанаваць і адстойваць беларускае слова, бо гэта пагражала зняволеннем. У астрогі траплялі як беларусы, так і прадстаўнікі іншых славянскіх народаў. Той жа Піліп Пестрак правёў 11 гадоў у розных турмах. А ў літаратуры згаданы перыяд пісьменнікі адлюстравалі ўжо ў 1940—1950-я гады. У дадатак да напісанага Валянцінам Таўлаем, Міхасём Васільком з'явіліся творы нашых амаль што сучасных пісьменнікаў Янкі Брыля, Вячаслава Адамчыка і іншых. І тое яшчэ таксама патрабуе асобных даследаванняў, знойдзе сваё адлюстраванне і на старонках літаратурна-мастацкіх часопісаў, у гісторыка-літаратурных артыкулах. Разам з тым шмат ужо зроблена. Напрыклад, кніга «Спрадвечны бераг», якая была выдадзена сумесна з Гродзенскай абласной бібліятэкай імя Карскага, змяшчае вялікую падборку вершаў Міхася Васілька.

**Кіраўнік Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла КЕБІЧ** распавяла, як на Гродзеншчыне шануюць спадчыну пісьменнікаў таго няпростага для нацыі часу.

— Мы з дня стварэння нашага абласнога аддзялення цікавіліся сваімі папярэднікамі. Таму вельмі часта наведвалі і мясціны, і музеі гэтых пісьменнікаў, пра іх у нас пішуць кнігі, іх творчасць даследуюць. Напрыклад, у Лідзе знаходзіцца домік-музей Валянціна Таўлая. Вельмі плённа працуе ў тэме Алесь Хітрун. Ён знаёміць моладзь з жыццём і дзейнасцю Таўлая, — распавядае Людміла Кебіч. — А што датычыцца Міхася Васілька і іншых пісьменнікаў гэтай кагорты, то іх імёны носяць вуліцы і школы ў Гродне. Шмат напісана ўжо нашымі пісьменнікамі нарысаў пра тых людзей. Яны — прыклад мужнасці, цярплівасці, якія ў любых умовах пісалі пра Радзіму. І гэтыя людзі і нас натхняюць. Мы ладзілі конкурс Міхася Васілька і будзем працягваць такую практыку. Варта адзначыць, што глыбокія даследаванні ў галіне літаратурнай творчасці пісьменнікаў вядзе Гродзенскі ўніверсітэт. Дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аліна Сабуць сёлета атрымала за сваю кнігу «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры XX–XXI стагоддзяў» Нацыянальную літаратурную прэмію. Ёсць і іншыя таленавітыя даледчыкі. Ёсць кім ганарыцца і каго браць сабе ў прыклад.

У традыцыях беларускага кнігавыдавецтва заўсёды ўдзялялася ўвага творчасці літаратараў з Заходняй Беларусі. І падчас круглага стала нарадзілася пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім аддзелам СПБ і выдавецтвам «Чатыры чвэрці». Мяркуецца, што ў новае выданне «Словаяднанне» ўвойдуць вершы, напісаныя сучаснымі творцамі пра паэтаў мінулага. Многае робіцца краязнаўцамі, гісторыкамі, мастакамі слова, мовазнаўцамі. Так, нядаўна ў выдавецтве «Беларуская навука» свет убачыла кніга, прысвечаная архіўнай спадчыне Браніслава Тарашкевіча.

— Дзень народнага адзінства я ўспрымаю ў больш шырокім сэнсе, чым толькі прывязку да 17 верасня. Тэма народнага адзінства была заўсёды для нас важнай. Сёння дзяржавай шмат увагі аддаецца патрыятычнаму выхаванню, захаванню нашых нацыянальных духоўных каштоўнасцяў. А фарміраванне патрыятызму немагчымае без ведання нашай гісторыі, культуры, літаратуры, мовы. І некалькі слоў я хачу прысвяціць моўнаму аспекту, паколькі мова — адзін з найважнейшых складнікаў нашай культуры, нашага патрыятычнага выхавання, — кажа **дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа, кандыдат філалагічных навук Ігар КАПЫЛОЎ**. — Светабачанне народа, яго сацыяльны вопыт — гэта цэлы комплекс таго, што вызначае нас як нацыю. Калі паглядзець на нашу гісторыю, то менавіта мова заўсёды служыла тым важным, вызначальным фактарам, які садзейнічаў і кансалідацыі нашага народа, і фарміраванню нацыі, і нашаму адзінству. І калі звярнуцца да перыяду 1921—1939 гадоў, то, з аднаго боку, у Заходняй Беларусі былі даволі дэмакратычныя так званыя крэсовыя законы, прынятыя ў 1934 годзе, якія гарантавалі беларусам выкарыстанне сваёй нацыянальнай мовы. Але, на жаль, яны альбо выконваліся часткова, альбо зусім не выконваліся, і ў выніку ў 1939 годзе ў Заходняй Беларусі на 4 млн беларусаў не было ніводнай беларускай школы, ніводнай ВНУ, бібліятэкі, тэатра, а беларускія газеты, калі выходзілі, то закрываліся адразу пасля выхаду некалькіх нумароў. Афіцыйнай мовай у дзяржаўных установах стала толькі польская. Усё было накіравана на тое, каб беларусы страцілі сваю ідэнтычнасць. Добра, што ў нас ёсць такое свята і магчымасць для асэнсавання падзей мінулага.

Няма сумневаў, што і надалей творцы-папярэднікі, якія аддана служылі свайму народу, будуць прыкладам для наследавання і плённай работы нашых сучаснікаў. Бо толькі пражыўшы былое, можна будаваць новае. А таксама знаходзіць у гэтым працэсе аднадумцаў, адчуваць еднасць са сваім народам і роднай зямлёй.

**Алена ДРАПКО.**

# РАТАВАЛЬНЫЯ АПЕРАЦЫІ НЕ МАЮЦЬ НІ МЕЖ, НІ ТЭРЫТОРЫЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асаблівая ўвага — пытанням навукова-тэхнічнага забеспячэння дзейнасці ў галіне абароны насельніцтва і тэрыторый ад надзвычайных сітуацый, забеспячэнню шматузроўневай спецыялізаванай падрыхтоўкі кадраў.

— У 2007 годзе быў створаны каардынацыйны савет, — расказаў журналістам **міністр па надзвычайных сітуацыях Беларусі Вадзім СІНЯЎСКІ**. — Штогод (не радзей чым адзін раз на год) па палажэнні, зацверджаным Саветам сіл калектыўнай бяспекі АДКБ, праводзіцца Каардынацыйны савет кіраўнікоў ратавальных ведамстваў членаў — удзельнікаў АДКБ, на якім плануецца работа на чарговы год і вызначаюцца вынікі мінулага года. Што характэрна для старшынства Беларусі, мы як дружалюбны народ, беларусы, заўсёды хацелі з'яднаць наша ведамства ў адным важным, галоўным інтарэсе — на карысць людзей, на карысць ратавання, на карысць тых задач, якія мы абавязаны вырашаць па сваім прызначэнні. Лічу, што гэта ўдалося. Усе мерапрыемствы, якія былі запланаваны, рэалізаваны паспяхова не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і на тэрыторыі іншых сумежных краін — удзельніц АДКБ.

Кіраўнік ведамства адзначыў, што, акрамя самога планавання мерапрыемства, досыць актыўна вялася работа па пытаннях папярэджання і прафілактыкі надзвычайных сітуацый, гібелі людзей у нашай краіне. «Дзяліліся гэтым вопытам з калегамі падчас візіту прадстаўнікоў краін — удзельніц АДКБ, — паведаміў ён. — Вельмі шмат зрабілі па лініі Універсітэта грамадзянскай абароны: як у дачыненні да сваіх кампетэнцый і магчымасцяў, так і ў дачыненні да тых удзельнікаў, якія з намі працуюць. Удалося вырашыць важныя задачы, звязаныя з забеспячэннем нашых падраздзяленняў у Беларусі. Мы гэта рабілі адкрыта, дэманстравалі магчымасці нашых вытворцаў членам — удзельніцам АДКБ. Наша сучасная аварыйна-ратавальная тэхніка пастаўлена не толькі ў краіны-ўдзельніцы, але і ў краіны Афрыкі, іншыя рэгіёны. Мы прынялі ўдзел у дэманстрацыі гэтай тэхнікі з нашым навуковым суправаджэннем, з нашай акрэдытацыяй МНС у В'етнаме. Гэта значыць, усе задачы, якія былі вызначаны, вырашаны паспяхова».

Вынікам зробленага стала комплекснае вучэнне «Скала-2023», якое было праведзена на тэрыторыі Беларусі. Міністр адзначыў высокі ўзровень падрыхтоўкі ратавальнікаў краін — удзельніц АДКБ.

«Вучэнні ў Рэспубліцы Беларусь былі праведзены на вельмі добрым



узроўні, — акцэнтаваў увагу **міністр па надзвычайных сітуацыях Казахстана Сырым ШАРЫПХАНАЎ**. — Усе падраздзяленні адпрацавалі свае задачы ў поўным аб'ёме. Заўважны прафесіяналізм ратавальнікаў, пажарных, лётчыкаў. Гэта было зладжанае, прадуманае ад пачатку да канца мерапрыемства, якое ўвасоблена ў рэальнасці. Думаю, што гэтыя вучэнні дазволяць і далей развіваць прафесіяналізм, узаемную зладжанасць, узаемадзеянне. Усе ратавальнікі адпрацавалі на сваіх месцах толькі на выдатную ацэнку».

Кіраўнік ведамства Казахстана распавёў, што ў наступным годзе прымаць вучэнні будзе іх краіна. Ужо ёсць свае ідэі, задумкі. «У наступным годзе вы ўбачыце добрую, якасную працу нашых ратавальнікаў, — удакладніў ён. — Думаю, што мы будзем працаваць з тым, каб прадэманстраваць прафесіяналізм пажарных, ратавальнікаў, дзеянні ратавальнікаў на скалах, бо вучэнні запланаваны ў Астане. Там ёсць магчымасць прадэманстраваць прафесіяналізм. Важна, каб назва вучэнняў адпавядала рэчаіснасці».

Кажучы аб старшынстве ў АДКБ Беларусі, **намеснік Генеральнага сакратара Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Валерый СЕМЕРЫКОЎ** нагадаў, што Аляксандр Лукашэнка, старшыня Савета калектыўнай бяспекі, абвясціў прыярытэты. «Я сказаў бы, што гэтыя прыярытэты амбіцыйныя, — адзначыў ён. — У рэалізацыі гэтых прыярытэтаў быў падрыхтаваны адпаведны Нацыянальны план. Магу канстатаваць з поўнай адказнасцю, што гэты план практычна цалкам выконваецца. Гэта добры паказчык».

Намеснік Генеральнага сакратара АДКБ падкрэсліў, што вучэнні былі арганізаваны на самым высокім узроўні з пункту гледжання арганізацыі, планавання, кіравання ўсіх відаў забеспячэння. «Мая ацэнка — «выдатна», — заявіў Валерый Семерыкоў. — План амбіцыйны, бо ахоплівае многія сферы дзейнасці. Не акцэнтуецца ўвага, напрыклад, толькі на пытаннях барацьбы з тэрарызмам, экстрэмізмам або ваенным супрацоўніцтве. Ён ахоплівае цалкам комплекс усіх мерапрыемстваў усіх напрамкаў дзейнасці нашай арганізацыі. План выконваецца — а значыць вынікі будуць добрыя. Я асабіста не кантактаваў з замежнымі назіральнікамі з НАТА, таму я не магу сказаць, якую мэту яны тут пераследвалі, назіраючы за нашымі вучэннямі. Але магу сказаць адно: ім было на што паглядзець, а нам было што паказаць».

Добрую падрыхтаванасць беларускага боку адзначыў і **міністр па надзвычайных сітуацыях Кыргызстана Баобек АЖЫКЕЕЎ**. «Вучэнне каторы раз прадэманстравала прафесіяналізм, адвагу, самаадданасць ратавальнікаў усіх нашых ведамстваў, і, сапраўды, ратавальныя аперацыі не маюць ні межаў, ні тэрыторый, — пераканаены ён. — У мінулым годзе мы ўсе прынялі актыўны ўдзел у ліквідацыі наступстваў надзвычайнай сітуацыі ў Турцыі. Думаю, перыядычныя вучэнні прыносяць рост прафесіяналізму, узаемадзеяння, і, вядома, нашы ведамствы знаходзяцца ў пастаяннай сувязі. Матэрыяльна-тэхнічная база Беларусі на годным узроўні, але важны і чалавечы фактар. Прафесіяналізм, навучанасць і веданне сваёй справы ратавальнікаў беларускага ведамства — на найвышэйшым узроўні».

«Мы за два дні паспелі паглядзець, як арганізаваны навучальны працэс, як міністэрства працуе з насельніцтвам па пытаннях папярэджання і прафілактыкі ўсіх напрамкаў, якія датычацца дзейнасці па надзвычайных сітуацыях, — распавёў **старшыня Камітэта па надзвычайных сітуацыях і грамадзянскай абароне Таджыкістана Рустам НАЗАРЗОДА**. — Я ўражаны ўбачаным. Пабываў у адукацыйным цэнтры, ніколі не бачыў такія. Беларускія калегі правялі вялікую работу для таго, каб падрыхтаваць насельніцтва, і ў першую чаргу дзяцей, да розных надзвычайных сітуацый. Хачу павіншаваць калег з такімі вялікімі дасягненнямі. У вучэннях упершыню прымалі ўдзел ратавальнікі з Таджыкістана. У невялікай колькасці, але мы і далей будзем удзельнічаць у такіх мерапрыемствах у большым маштабе. Для нас гэта школа».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — АБАРОНА НАСЕЛЬНІЦТВА

## Завяршылася актыўная фаза вучэння ратавальных падраздзяленняў дзяржаў — членаў АДКБ «Скала-2023»

**На палігоне філіяла «Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі» Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, які знаходзіцца пад Барысавам, беларускія ратавальнікі сумесна з калегамі з Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана адпрацавалі ўзаемадзеянне пры правядзенні аварыйна-ратавальных і іншых неадкладных работ, паведамілі ў прэс-службе МНС.**

За ходам вучэння назіралі кіраўнікі ратавальных ведамстваў Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана і Расіі, якія з'яўляюцца членамі Каардынацыйнага савета па надзвычайных сітуацыях дзяржаў — членаў АДКБ, а таксама дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч, намеснік Генеральнага сакратара АДКБ Валерый Семерыкоў, першы намеснік Генеральнага сакратара СНД Леанід Анфімаў, намеснік міністра грамадскай бяспекі В'етнама Нгуен Ван Лонг, а таксама надзвычайныя і паўнамоцныя паслы Арменіі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі.



Удзельнікі вучэння адпрацавалі розныя сцэнарыі надзвычайных сітуацый і правялі комплекс аварыйна-ратавальных мерапрыемстваў на 12 пляцоўках. Усяго было задзейнічана звыш 380 чалавек і 94 адзінкі тэхнікі.

Як звярнуў увагу **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ**, комплекс вучэнняў праходзіць на фоне адзінай аператыўна-стратэгічнай абстаноўкі і вырашае адзіныя задачы па забеспячэнні бяспекі, перш за ўсё, насельніцтва на тэрыторыі той краіны, у якой спланавана і праходзіць аперацыя. «Аб важнасці і неабходнасці вучэння сведчыць тое, што ў гэтым мерапрыемстве бяруць удзел і прыбылі для назірання за дзеяннямі сваіх кантынгентаў міністры ратавальных ведамстваў, — адзначыў ён. — Гэта паказвае сапраўдную значнасць і неабходнасць правядзення такіх мерапрыемстваў, бо, акрамя вырашэння пытанняў, звязаных з ваеннымі пагрозамі, вядома ж, давядзецца вырашаць пытанні, звязаныя з абаронай насельніцтва».

Па словах **міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі Вадзіма СІНЯЎСКАГА**, дэманстрацыя на палігоне стала завяршальным этапам работы па ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый (у першую чаргу пры аварыі на атамнай электрастанцыі) у рамках вучэння. «Мы ў дынаміцы развілі магчымыя наступствы, якія могуць здарыцца, — заўважыў кіраўнік ведамства. — Лічу, што мы справіліся на цвёрдую добрую адзнаку. Разбор яшчэ будзе праведзены ў далейшым па падраздзяленнях, па блоках, па надзвычайных сітуацыях. Мы, безумоўна, звернем увагу на дапушчаныя недакладнасці, памылкі і нюансы, але ў цэлым работа праведзена паспяхова, усе надзвычайныя сітуацыі ліквідаваны».



Фота прэс-службы МНС.

Спецыяльнае вучэнне «Скала-2023» упершыню прайшло на тэрыторыі Беларусі ў рамках старшынства беларускага боку ў АДКБ і адбылося ў адзінай задуме з сумесным вучэннем Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ «Узаемадзеянне-2023». Усяго ў вучэнні было задзейнічана звыш 630 чалавек і ста адзінак тэхнікі.

**Вераніка КАНЮТА.**

Проста аб складаным

# ЭКСПЕРЫМЕНТЫ, ВОПЫТЫ, ЛЕКЦЫІ, ШОУ

## Чым здзіўлялі арганізатары самага маштабнага ў краіне навуковага фэсту?

**Ці можа празмернае спажыванне бананаў прывесці да ўнутранага апраменьвання? На чым грунтуецца біялагічная фантастыка? Як робіцца астранамічныя адкрыцці? Чаму выраз «тараканы бегаюць у галаве» не пазбаўлены фізіялагічнага тлумачэння? Пра гэта і многое-многае іншае маглі даведацца ўдзельнікі Фестывалю навукі, які прайшоў у Цэнтральным батанічным садзе ўжо пяты раз.**

**Арганізатарамі навуковага ўік-энду выступае Савет маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук. Фестываль навукі стаў ужо, так бы мовіць, іх брэндам. Менавіта маладыя навукоўцы падхапілі сусветную тэндэнцыю па папулярызацыі навукі і паставілі мэту — даказаць, што навука можа быць нясумнай, здольна захапіць і доўга не адпускаць. Заняткі навукай — гэта і захапляльна, і перспектыўна...**

**Каб да мерапрыемства не знікаў інтарэс, арганізатары імкнуцца не паўтарацца і кожны год дадаюць у праграму новыя «іскрынкі». Для прыкладу: сёлета з'явілася новая зона Sci-fi, дзе можна было даведацца, як навука ўплывае на масавую культуру, а таксама пра сацыялагічныя прагнозы і лічбавую філасофію, паўдзельнічаць у навуковых майстар-класах у стылістыцы навуковай фантастыкі і коміксаў, сустрэцца з вядомым аўтарам-фантастам — Вольгай Грамыкай. Упершыню ў мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі з Расійскай Федэрацыі: навукова-пазнавальны цэнтр «Запаведнае пасольства» парка «Зарадддзе» і Расійскі хіміка-тэхналагічны ўніверсітэт імя Мендзялеева з майстар-класамі і навуковымі шоу. А Усерасійскі фестываль NAUKA 0+ і дзяржкарпарацыя «Расатам» застаюцца нязменнымі гасцямі ў беларускай сталіцы.**

### АСАБЛІВЫ СВЕТ

Адкрываючы фестываль, **Старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір ГУСАКОЎ** падкрэсліў: «Наша задача — не столькі прэзентаваць складаныя навукаёмістыя тэхналогіі, колькі паказаць, наколькі навука цікавая і прывабная. Гэта бясконцы працэс спазнання, а навукоўцы — людзі настолькі захопленыя сваёй справай, што не ўяўляюць іншага ладу жыцця. Гэта асаблівы свет. Вучоныя кожны дзень нешта даследуюць, аналізуюць, ставяць вопыты, адкрываюць новае, ствараюць прыборы, станкі, механізмы. А фестываль — магчымасць расказаць аб гэтым у папулярнай форме ўсім ахвотным. Моладзь імкнецца займацца даследаваннямі: штогод у Нацыянальную акадэмію навук прымаюць каля 300 маладых вучоных. А ў 2023/2024 навучальным годзе вучыцца ва Універсітэце НАН Беларусі будуць 150 магістрантаў, у тым ліку замежныя грамадзяне».

Адным з гасцей фестывалю стаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА.** Яму прадэманстравалі распрацоўкі ў розных сферах, у тым ліку ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, медыцыне, экалогіі, прыродакарыстанні, ахове навакольнага асяроддзя. Ён пагутарыў з многімі маладымі спецыялістамі, прадстаўнікамі акадэмічнай і ўніверсітэцкай навукі. «Самае галоўнае, што аб'ядноўвае ўсіх распрацоўшчыкаў, — апантанасць, — гэта рухавік прагрэсу, — падкрэсліў ён. — Упэўнены, што за маладымі хлопцамі і дзяўчатамі — і тымі, што дэманструюць свае першыя крокі ў навуцы, і тымі, хто ўжо нечага дасягнуў, — будучыня».

### КОДЭКС ЭТЫКІ ДЛЯ ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ

Дзве лакацыі — выстава-конкурс «100 ідэй маладых вучоных» і пляцоўка «Універсітэт будучыні» — былі разлічаны найперш на дарослую аўдыторыю. Напрыклад, Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі прадставіў увазе наведвальнікаў макет аўтаматычнай бульбасартавальнай машыны.

— Яна прызначана для аддзялення некандыцыйных клубняў бульбы на стадыі перадпродажнай падрыхтоўкі ў аўтаматычным рэжыме з дапамогай сістэм машыннага зроку і аўтаматычнай інспекцыі. На рамянным канвееры клубень робіць поўны абарот вакол сваёй восі для вызначэння знешніх дэфектаў. Сістэма машыннага зроку распазнае на знешняй паверхні клубняў сляды пазеляненння, захворванняў, механічныя пашкоджанні, нарасты, чарвяточыны і ідэнтыфікуе клубні з гэтымі дэфектамі як некандыцыйныя, пасля чаго выдаляе іх з канвеера струменем сціснутага паветра, — патлумачыў **навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі Максім КУРЫЛОВІЧ.**

**Навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі НАН Беларусі Андрэй СУЛЯЙКОЎ** пазнаёміў нас з Сістэмай этыка-прававога рэгулявання выкарыстання тэхналогій штучнага інтэлекту ў фінансавым сектары. Паўсюднае ўкараненне сістэм штучнага інтэлекту — адзін з найважнейшых сучасных трэндаў. Многія краіны свету ўжо маюць канцэптуальныя дакументы, якія кантралююць штучны інтэлект. Ідзе па гэтым шляху і наша краіна.

Кодэкс этыкі, які прадставіў навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі, уключае чатыры главы: этыку распрацоўшчыка і вытворцаў сістэм штучнага інтэлекту, этыку ўзаемадзеяння штучнага інтэлекту з чалавекам, этыку стваральнікаў праграмнага забеспячэння, сістэм штучнага інтэлекту, этыку прыняцця рашэнняў штучным інтэлектам і прынцыпы адказнасці ў галіне штучнага інтэлекту.

### ІНТЭРАКТЫВЫ І МАЙСТАР-КЛАСЫ

Медыцына, космас, экалогія, атамныя тэхналогіі, робаты — наведвальнікаў фестывалю чакалі самыя разнастайныя пляцоўкі.

Так, студэнты фізічнага факультэта БДУ ладзілі для малодшай школьнай аўдыторыі майстар-класы, дзе дэманстравалі фізічныя доследы. На занятку «Фізіка цацак» расказвалі аб прынцыпах, якія ляжаць у аснове работы такіх механічных цацак, як кельцкі камень, кітайскі ваўчок і картэзіянскі вадалаз. На майстар-класе «Электрычнасць» маладыя вучоныя праводзілі доследы з пераўтварэннем электрамагнітнай энергіі. Для гэтага выкарыстоўваліся спецыялізаваныя прыборы, напрыклад, трансфарматар Тэсла і электрафорная машына. Мэта — пра складаныя рэчы расказаць даступнай мовай.

Каманда хімічнага факультэта БДУ падрыхтавала для наведвальнікаў 16 відовішчных доследаў, заснаваных на хімічных рэакцыях. Гасцей знаёмілі таксама з дзейнасцю гуртка «Школа юнага хіміка БДУ» і праектам «Віртуозы навукі».

На пляцоўцы «АТОМ ТЕАМ» наведвальнікаў чакалі інжынерныя майстар-класы і інтэлектуальныя гульні, навуковыя інтэрактывы і атамныя віктарыны. Любы ахвотны мог запусціць ланцуговую рэакцыю, разагнаць Кола да Вінчы, сабраць радыёпрыёмнік, які працуе без батарэек, і камеру Вільсана, у якой можна ўбачыць радыяцыю.

### «СУСВЕТ АБАВЯЗКОВА ПАЧУЕ...»

На пляцоўцы «Космас» была арганізавана серыя лекцый пра касмічныя аб'екты і іх даследаванне, тэлескопы і спадарожнікі. Галоўнымі гасцямі сталі **лётчык-касманаўт, Герой Расіі, член атрада касманаўтаў Навукова-даследчага выпрабавальнага цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына Алег НАВІЦКІ і кандыдаты на касмічны палёт ад Беларусі Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ і Анастасія ЛЯНКОВА,** якія расказалі аб падрыхтоўцы да палёту і адказалі на пытанні гасцей фестывалю. А пытанняў да іх было шмат. Што адчувае касманаўт, які выходзіць у адкрыты космас? Якія чаканні ад сустрэчы з космасам у дзяўчат? Што самае складанае ў іх падрыхтоўцы да палёту? Якія ў іх любімыя фільмы? Якія спецыфічныя цікавыя словы выкарыстоўваюць касманаўты?

Нагадаем, што палёт экіпажа з беларускай дзяўчынай-касманаўтам запланаваны на сакавік наступнага года. Марына Васілеўская ўключана ў асноўны склад каманды, у якую таксама ўвайшлі Алег Навіцкі (камандзір) і Трэйсі Дайсан (астранаўт NASA). Прадугледжваецца, што экіпаж будзе знаходзіцца на МКС 12 сутак. Беларуска Анастасія Лянкова ўвайшла ў дублявальны састаў.

— Мае чаканні ад палёту самыя касмічныя, — прызналася Марына Васілеўская. — Вельмі хочацца ўбачыць нашу планету зверху, адчуць бязважкасць. Фізічная падрыхтоўка ў нас вельмі сур'ёзная, шэсць гадзін на тыдзень: гэта і плаванне, і скачкі ў ваду, і бег, і батуты... Плаваць мы павінны на адлегласць у 800 метраў. Для дзяўчат ніякіх скідак не робіцца. Нарматывы агульныя і для мужчын, і для жанчын, паколькі ў расійскім атрадзе касманаўтаў цяпер толькі адна жанчына. Дабодзіцца выстаўленым патрабаванням адпавядаць. Для мяне асабіста вельмі складана было запомніць усе абрэвіятуры, якія выкарыстоўвацца на касмічнай станцыі.

— Нас рыхтуюць да нештатных сітуацый, расказваюць, як працуюць сістэмы жыццезабеспячэння, вучаць, як з імі працаваць. Тое, што тут, на Зямлі, бачыцца нам стандартным, у космасе надзвычай важнае, — расказала Анастасія Лянкова. — Мы не задумваемся, адкуль бярэцца кісларод, як утылізаваць вуглякіслы газ. А ў касмічнай прасторы гэта неабходныя ўмовы выжывання. Яшчэ разбіраемся з аварыйнымі сістэмамі...

— На караблі «Саюз» па дарозе да станцыі і назад мы карыстаемся рускай мовай і маскоўскім часам. Пасля стыкоўкі з міжнароднай касмічнай станцыяй экіпаж пераходзіць на час па Грынвічу, а афіцыйнай мовай лічыцца англійская. Насамрэч мы выкарыстоўваем змешаную мову, бо мы не палігloты, — усміхаецца Алег Навіцкі. — Робім выгляд, што размаўляем на англійскай мове, а нашы замежныя калегі — што на рускай (яны яе таксама вывучаюць). Галоўнае — адзін аднаго разумеем.

«А што трэба зрабіць, каб стаць касманаўтам?» — пацікавіліся ўдзельнікі сустрэчы ў спікераў.

— Трэба добра вучыцца і моцна верыць у сваю мару. Сусвет усё чуе і дасць магчымасць. Галоўнае — яе не прапусціць, — упэўнена Анастасія Лянкова.

— Неабходна сачыць за сваёй фізічнай формай, бо ў касманаўта здароўе павінна быць касмічным, — дадае Марына Васілеўская. — Важная таксама мэтанакіранасць, трэба рушыць у кірунку асваення фізікі, біялогіі, матэматыкі, ставіць мэту і дасягаць яе.

— На касмічнай станцыі вітаюцца людзі самых розных спецыяльнасцяў. Гэта могуць быць біёлагі, хірургі, выкладчыкі, — кажа Алег Навіцкі. — Мы, ваенныя, якія засталіся ў касмічным атрадзе, таксама займаемся навукай, як гэтага патрабуюць ад нас арганізатары эксперыментаў. Абавязковая якасць — прыстойнасць, нельга ісці па галовах, у атрадзе павінна быць здаровая канкурэнцыя...

Дарэчы, Марына Васілеўская па прафесіі бортправадніца «Белавія», а Анастасія Лянкова — дзіцячы хірург.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Лётчык-касманаўт, Герой Расіі, член атрада касманаўтаў Навукова-даследчага выпрабавальнага цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына Алег НАВІЦКІ і кандыдаты на касмічны палёт ад Беларусі Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ і Анастасія ЛЯНКОВА.**

### ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ «АДСТАЕ»

«Рэальныя нерэальныя нейратэхналогіі» — так гучала тэма навукова-папулярнай лекцыі, з якой выступіла на пляцоўцы «Медыцына» **загадчыца лабараторыі нейрафізіялогіі Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Святлана ПАШКЕВІЧ.**

Вучоны агучыла шмат цікавых фактаў, якія датычацца дзейнасці нашага мозгу. Штучны інтэлект, сцвярджае яна, нельга нават параўноваць з нашым розумам: гэта толькі адна функцыя апрацоўкі даных. Мозг — перш за ўсё біялагічная сістэма, і яна не працуе аналагічна тэхніцы.

Калі мы ўсвядомлена канцэнтруемся на нейкай задачы, то можам дасягнуць значна большага, чым з дапамогай тэхнічных прылад. Людзі, якія ўмеюць дакладна фармуляваць свае думкі, дасягаюць большага.

Чытанне і пісьмо — самы складаны від дзейнасці мозгу, які дазваляе кампенсаваць і павялічыць колькасць нейронаў у кары вялікіх паўшар'яў. Таму чытанне і пісьмо, не звязаныя з работай на камп'ютары, а звязаныя з абменам інфармацыяй, будуць аднаўляць нашы рэсурсы.

«У любой незразумелай сітуацыі — спіце! — сцвярджаюць навукоўцы. — Гэты жарт мае права на жыццё, таму што ў сне мозг латае, чыніць, аздараўляе не толькі сам сябе, але і ўвесь арганізм у цэлым. Што вы робіце звычайна, калі не ведаеце выйсце з сітуацыі? Вы губляеце энергію! Каб знайсці найлепшае рашэнне выхаду з тупіка і дакладны адказ на ваша жыццёвае пытанне, дайце мозгу дастаткова сну. Адказ прыйдзе хутка, і вы абавязкова знойдзеце выйсце».

А яшчэ вучоныя раяць: не лжыце, беражыце мозг! Даследаванне, праведзенае псіхолагам Робертам Фельдманам з Масачусецкага ўніверсітэта, паказала, што 60 працэнтаў людзей хлусяць хоць бы адзін раз за 10 хвілін размовы. У сярэднім за гэты прамежак часу чалавек хлусіць ад двух да трох разоў. Даследчы праект Універсітэта Нотр-Дам у Індыяне вывучаў наступствы паталагічнай хлусні. У даследаванні прынялі ўдзел 110 добраахвотнікаў, палова з якіх пагадзілася перастаць хлусіць, а іншая палова не атрымала ніякіх інструкцый. Пасля дзесяці тыдняў у групы, якая радзей ілгала, назіралася на 54 працэнты менш псіхічных скаргаў (на стрэс або неспакой) і на 56 працэнтаў менш праблем з фізічным здароўем (такіх як галаўныя болі ці праблемы са страваваннем).

А гэты факт проста не можа застацца незаўважаным: карыстальнікі сігналізуюць пра імклівую дэградацыю папулярнага чат-бота ChatGPT, створанага на аснове штучнага інтэлекту. Як раней гучна заяўлялася, гэты ўніверсальны чат-бот ужо здольны сапернічаць з чалавекам у інтэлектуальных і камунікатыўных задачах. Яго можна прымяняць для стварэння тэкстаў і вершаў, напісання тэхнічных артыкулаў, правядзення фінансавага аналізу, прагназавання і гэтак далей. Але нядаўняе даследаванне выявіла значнае зніжэнне «інтэлектуальнай» прадукцыйнасці моўнай мадэлі, якая ляжыць у аснове GPT-4. У чэрвені 2023 года ў параўнанні з пакашчыкамі сакавіка таго ж года дакладнасць адказаў скацілася з 97,6 працэнта да 2,4 працэнта. Акрамя таго, чат-бот стаў допускаць больш памылак пры выкананні праграмавання і не так «спагадліва» адказваць на далікатныя пытанні. Выказваюцца здагадкі, што штучны інтэлект дэградаваў пасля пастаянных стасункаў з чалавекам. А яшчэ ён навучыўся ад людзей ілгаць...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Каб помнілі

# «Я, мусіць, нарадзіўся ў кашулі?» —

## так казаў пра сябе ветэран Вялікай Айчыннай Лявон Дзям'янавіч Вяжэвіч, бо яму і сапраўды пашчасціла жывым і больш-менш здаровым вярнуцца з вайны

**...Тады, пасля аперацыі, ён рэдка выходзіў з хаты, але ж павітаў школьных краязнаўцаў, шмат цікавага расказаў пра сябе і нашу вёску Баяры, паказаў фотаздымкі і свае лісты з фронту, граматы, узнагароды. У яго быў добры настрой, Лявон Дзям'янавіч нават жартаваў (пра тую ж кашулю), бо ў 1945-м пабываў у Берліне, а да гэтага — «шмат разоў пакланіўся кулі», якая часцяком «ціўкала» паблізу і кагосьці раніла, а то і забівала.**





А неяк ноччу на перадавую прыехала кухня. Салдаты выйшлі з траншэі...

Адкуль узяўся той «шалёны» нямецкі снарад, не зразумеў ніхто. І ніхто з батарэі не выжыў.

Радавы Лявон Вяжэвіч быў ездавым, і ў тую ноч па загадзе камандзіра на конях адправіўся ў суседнюю вёску па гармату. Ён выканаў загад: своечасова даставіў зброю і, дзякуючы ёй, застаўся жывы.

У школьны музей Лявон Дзям'янавіч перадаў некалькі копій цікавых фотаздымкаў, свой ліст-трохвугольнік, які з фронту даслаў будучай жонцы, выказаў жаданне, каб краязнаўцы, калі яго не стане, забралі ў музей і іншыя рэчы, здымкі, лісты.

(Памёр ён неяк раптоўна, праз пару тыдняў пасля таго, як пахаваў сына: трэба разумець, не вытрымаў гора, да таго ж за жыццё і наваяваўся, і напрацаваўся...)

А наведвальнікі народнага школьнага музея «Ільянскія далягляды» цяпер з цікавасцю разглядаюць пацямнелы трохвугольнік з лістом, напісаным алоўкам на паперы з-пад пачка махоркі, і, вядома ж, фотаздымкі — кадры жыцця, якія сталі гісторыяй. На адным з іх, зробленым у маі 1941-га, — прызыўнікі райцэнтра Ілья разам з ваенкамам Аляксандрам Мікалаевічам Труханавым (на фота — чацвёрты справа ў першым радзе), які ў першы дзень акупацыі мястэчка адзін, з адным пісталетам распачаў бой з цэлым фашысцкім падраздзяленнем і па-геройску загінуў. Там жа, у першым радзе справа, Лявон Дзям'янавіч Вяжэвіч, прызваны ў Чырвоную Армію ў 1944-м — пасля вызвалення родных мясцін ад фашыстаў.

Дарэчы, гісторыя яго салдацкага ліста сёлета атрымала працяг: краязнаўцы нашай школы разам з тэлекампаніяй «МІР» працавалі над праектам «Пісьмо з фронту», у прысутнасці родных і блізкіх ветэранаў вайны зачытвалі падобныя лісты. Перад гэтым мы паразмаўлялі з мясцовымі жыхарамі і высветлілі, што ў Мінску жыве сын Лявона Дзям'янавіча — Мікалай. Яго дзеці і ўнукі, шануючы памяць ветэрана, згадзіліся паўдзельнічаць у здымках. Больш за тое, аказалася, што ў сям'і захоўваюцца яшчэ некалькі лістоў з фронту, фотаздымкі і нават... салдацкі дзённік, які вёў чырвонаармеец Вяжэвіч.

Копію дзённіка ў музей прыслала Марына Мікалаеўна Вяжэвіч, унучка ветэрана. З дазволу блізкіх мы паспрабавалі ўважліва прачытаць яго і вельмі здзівіліся, што просты (на першы погляд) вясковы хлопец з пяццю класамі адукацыі пісаў... вершам. А значыць, салдату (і ці толькі гэтаму?!), пасярод вайны, ва ўмовах баявых дзеянняў, было, што называецца, «да лірыкі». Можа, таму, што сам ён, маючы ровар і баян, шмат дзе іграў на вяселлях ды вечарынках, можа, таму, — што любай дзяўчыне, Марыі Юльянаўне Астроўскай — сваёй будучай жонцы.

У дзённіку — амаль штодзённая хроніка барацьбы з фашызмам, але і там не столькі пра баі, перамогі ды страты, не толькі пра пакуты ды цяжкую франтавую працу (пра яе хіба коратка, як пра нешта нязначнае: «Прыбылі ў прызначаны раён, хутка выкапалі ўкрыцці для байцоў, коней, гарматы...»)

Можна толькі ўявіць, колькі сіл і часу на гэта затрачана, аднак хлопец зусім не скардзіцца: піша пра свае назіранні, пра пачуцці і мары. Усе запісы прасякнутыя каханнем да дзяўчыны і любоўю да сваёй Радзімы, патрэбай знішчыць ворага, які пайшоў вайной...

Якраз гэта і ёсць сапраўдны патрыятызм, сапраўдны гераізм і сапраўдная адданасць Радзіме. Пацвярджэнне іх — баявыя адзнакі ветэрана. У Падольскім архіве захоўваецца інфармацыя аб узнагароджанні тэлефаніста 1042-га стралковага палка 295-й стралковай дывізіі, якая ўзняла Сцяг Перамогі над Брандэнбургскімі варотамі ў Берліне, Лявона Мяжэвіча ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Берліна»... Па словах сына, было яшчэ прадстаўленне на ўзнагароджанне ордэнам «Чырвонай Зоркі».



...Што дапамагло Лявону Дзям'янавічу выжыць на вайне, застаецца толькі гадаць. Малітвы маці і каханай дзяўчыны? Баявое майстэрства? Божая ахова? Лёс? А можа, і сапраўды ён нарадзіўся ў кашулі.

Пасля вяртання дамоў Лявон Вяжэвіч і Марыя Астроўская згулялі вяселле, дзе іграў не хто іншы, як Іван Суднік, той самы, славуты майстар музычных інструментаў (у тым ліку «белых баянаў») з вёскі Суднікі.

...Яшчэ адна гісторыя, адзін лёс і ліст. Яго для нашага народнага музея перадала Яўгенія Міронаўна, удава Міхаіла Вікенцевіча Пекарскага з вёскі Барсукі. Датаваны ён 13 ліпеня 1944 года. Адпраўленне з Палявой пошты 33455-П.

Цікава, што ліст напісаны лацінкай, па-беларуску з частковым ужываннем рускіх слоў. Тэкст удалося прачытаць амаль поўнасцю. Дапамагла ў гэтым школьны праграміст Тамара Генадзеўна Радаванавіч.

Адрас палявой пошты, указанай на паштоўцы, прывёў нас у 145-ы армейскі (франтавы) запасны стралковы полк, які займаўся падрыхтоўкай штурмавых батальёнаў з ліку навабранцаў да вядзення баявых дзеянняў. Сёння зразумела, што страты ў такіх падраздзяленнях былі велізарныя, і ў сваім лісце Міхаіл Вікенцевіч мог бы расказаць пра баі ды франтавыя цяжкасці, але абмежаваўся сціплым «жывы і здаровы», паведаміў, што прызваны з горада Віцебска, што са знаёмых тут нікога няма, прасіў «адпісаць яму чым хутчэй, што новага дома, ці здаровыя дзеці?» Апошнім радком: «Да свідания...»

Трэба разумець, спадзяваўся салдат на сустрэчу, але...

У цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі мы даведаліся, што чырвонаармеец М. В. Пекарскі 1913 года нараджэння памёр ад ран 30 жніўня 1944 года ў 430-м асобным медсанбаце, пахаваны ў вёсцы Прэцэнаэкі (Латвія), перапахаваны ў брацкую магілу (г. Прыекуле), дзе на абеліску ёсць надпіс «рядовой М. В. Пекарский (?—1944)» .

Унук Міхаіла Вікенцевіча Міхаіл Лявонавіч, — ветэран Афганскай вайны, часты госць у нашай школе.

У год Міру і стваральнай працы асабліва патрэбныя вось такія ўрокі гісторыі, сустрэчы з ветэранамі і нашчадкамі нашых землякоў, сціплых, простых людзей, сапраўдных патрыётаў і сапраўдных герояў.

**Алеся Юшко,**
**настаўніца Ільянскай СШ імя А. А. Грымаца,**
*Вілейскі раён.*

Чалавек — чалавеку

# ПРАСТОРА — ГЭТА НЕШТА ІНШАЕ

**У каго што баліць... Не ведаю, як вы, а я даўно ўжо стала заўважаць, што моладзь жыве неяк адасоблена. Пытаю ў пляменніцы (яна здымае адзін пакой у вялікай кватэры), хто жыве ў яе за сценкай, і чую хіба імёны ды назвы месцаў работы (суседкі мяняюцца): школа, садок, бальніца. Адказ на пытанне, якія канкрэтна, адкуль тая дзяўчына родам, хто яе бацькі — гэта ўжо з фантастыкі: не ведаю... А то яшчэ "лепш": «Ну якая розніца?..» І ў дадатак: «Гэта — асабістая прастора чалавека. Нельга яе парушаць».**

Думаю: а добра тое ці дрэнна?

У часы маёй маладосці мы ўсё пра ўсіх ведалі, і гэта, згадзіцеся, часта засцерагала нас ад памылак, дазваляла, што называецца, «паплакаць у камізэльку», у моманты адчаю пачуць словы парады і падтрымкі. Мы заўважалі, хто чым дыхае, які ў каго настрой, што робіцца ў жыцці аднакурснікаў і калег.

Сёння ўсё інакш: нічога не кажы, не ўмешвайся, не парушай той асабістай прасторы... І вось яны, плады гэтай маўклівасці. Жанчына з вёскі расказвае, што яе дачка (шчасце, што ў іх даверлівыя адносіны!) вучыцца ў Мінску, што пазнаёмілася там са сваім земляком, які вельмі ёй спадабаўся, што нават схадзіла да яго «на кубачак кавы».

Маці захвалявалася (ну яшчэ б!), спытала прозвішча хлопца і з жахам даведалася, што ён — досыць блізкі сваяк. І гэта шчасце яшчэ, што адносіны паміж маладымі зайшлі недалёка, а то ж не мінуць бяды!

Магчыма, я памыляюся, але ж бяруся сцвярджаць, што яны, гэтыя беды, цяпер побач (літаральна), і па прыклад далёка не пайду. У сваёй прыяцелькі — як здавалася, маладой шчаслівай матулькі — неяк спытала, калі ўжо грошай збяруць на другое дзіцятка? А яна ў адказ — што цяпер не да гэтага, бо яны з мужам... разводзяцца.

Як?! Мы жывём амаль побач, вельмі часта сустракаемся і не ведаем, што ў каго на сэрцы, бо ў маладых не «модна» некага пускаць на сваю асабістую прастору.

А самі неяк жа ў ёй трымаюцца? Выгляду не падаюць! І пры гэтым псіхалагічна выгараюць, не могуць справіцца з праблемамі... А падзяліліся б, расказалі пра іх раней — і, магчыма, разам адшукалася б нейкае выйсце, удалося б адвесці бяду, што навісла над маладой сям'ёй, спыніць перад краем...

Іншымі словамі, месца, дзе адзінока і холадна, нельга, па-мойму, называць прасторай. Гэта хутчэй клетка, у якую мы самі сябе заганяем і потым не можам выйсці.

А прастора — гэта іншае: там лёгка дыхаць, там хочацца жыць, там можна пачуць слушную параду блізкага і — галоўнае — заўсёды адчуваць сябе патрэбным.

**Валянціна Бобрык,**
*г. Івацэвічы.*

Усмешачку!

# Чароўная сіла мастацтва

**Амаль паўвека таму я служыў у войску разам з рускімі, украінцамі, латышамі, эстонцамі, таджыкамі, узбекамі... Каго ў нас толькі не было!..**

Мы, беларусы, трымаліся разам і вельмі фарсілі, бо на піку папулярнасці былі нашы «Песняры»: іх песні гучалі паўсюль. І не дзіва: прыгожыя галасы і мелодыі! Цудоўныя словы! Помніце «Бывай...» Аркадзя Куляшова:

*...Пайшла, пакінуўшы мне*
*золкі і туманы,*
*Палынны жаль*
*смугой ахутаных дарог,*
*Каб я хвілінны боль*
*і горыч гэтай раны*
*Гадамі ў сэрцы заглушыць*
*сваім не мог...*

Дык вось, чарговае выкананне, а потым дыялог:

— Ты з Беларусі? — пытае ў мяне саслужывец Рустам.

— З Беларусі.

— Тады скажы мне, што такое «каб'я»?

— ?!

— Ну вашы ж «Песняры» спяваюць: «Каб'я хвілінны боль...»

— А ўсе папярэднія словы, — здзіўляюся я, — ты што — зразумеў?

— А як жа! Мне іх музыка пераклала!

Яна, згадзіцеся, магла. І можа!

**Іван Цітовіч,**
*Пастаўскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

6 верасня 2023 г. № 32 (718)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

# ПРЫКЛАД СУПРАЦОЎНІЦТВА, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ

## У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча Наталлі КАЧАНАВАЙ са Старшынёй Сената Олій Мажліса Танзілой НАРБАЕВАЙ

**Па запрашэнні верхняй палаты парламента працягваецца афіцыйны візіт парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Узбекістан на чале са спікерам Сената Олій Мажліса. Наталля Качанава назвала сімвалічным тое, што візіт праходзіць у год 30-годдзя дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Узбекістанам. «Дынаміку нашым адносінам надаюць добрыя сяброўскія адносіны паміж прэзідэнтамі нашых краін — паважанымі Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам і Шаўкатам Мірамонавічам Мірзіёевым, — звярнула ўвагу спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Для нас Узбекістан — абсалютна сяброўская, родная краіна. Мы сапраўды вельмі падобныя ментальна. Народ Узбекістана — працаўнік. Народ Беларусі — дакладна такі ж працаўнік. Гэта тое, што нас зближае».**







Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Наталля Качанава адзначыла, што сувязі паміж дзвюма краінамі развіваюцца абсалютна па ўсіх кірунках: у эканоміцы, гуманітарнай сферы і інш. Але для парламентарыяў, па словах спікера, вельмі важным з'яўляецца міжпарламенцкае супрацоўніцтва. У гэтай сувязі Старшыня Савета Рэспублікі падзякавала Танзіле Нарбаевай за добрыя адносіны, якія складваюцца паміж верхнімі палатамі парламентаў Беларусі і Узбекістана.

«У нас працуюць групы дружбы, мы падтрымліваем адзін аднаго на міжнародных пляцоўках, — звярнула ўвагу спікер верхняй палаты парламента Беларусі, кажучы аб узаемадзеянні па парламенцкай лініі. — Мы вельмі ўдзячныя вам за падтрымку па паскораным уступленні нашай краіны ў ШАС, членам якой з'яўляецца Узбекістан. Голас парламентарыяў павінен гучаць гучна, дакладна, улічваючы тую палітыку, якая праводзіцца ў нашых краінах. А палітыка ў нашых краінах — гэта перш за ўсё чалавек з яго патрэбамі, клопатам, праблемамі. Як сказаў глыбокапаважаны Аляксандр Рыгоравіч, палітыка нашай краіны — гэта звычайнае жыццё. Дакладна так, як і ў вашай краіне. І гэта таксама нас аб'ядноўвае. Таму мы, парламентарыі, абраннікі народаў, павінны рабіць усё для таго, каб гэтыя добрыя сяброўскія адносіны развіваліся, працягваліся, умацоўваліся».

Новы імпульс двухбаковаму супрацоўніцтву, па меркаванні Наталлі Качанавай, надае афіцыйны візіт парламенцкай дэлегацыі Узбекістана ў нашу краіну, а таксама Першы жаночы беларуска-ўзбекскі бізнес-форум, які праходзіць у яго рамках. Усе дамоўленасці будуць рэалізаваны — за гэтым будуць сачыць спікеры парламентаў. «Мы — сапраўдныя сябры, у гэтым няма ніякага сумнення, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Усё, што мы робім, гэта на карысць нашых краін, нашых народаў і нашага сяброўства». Спікер упэўнена, што супрацоўніцтва будзе працягвацца і па лініі міжнародных, маладзёжных і грамадскіх арганізацый. Гэта, па яе словах, таксама будзе аб'ядноўваць дзве краіны.

У сваю чаргу Старшыня Сената Олій Мажліса Танзіла Нарбаева падзякавала за гасціннасць, аказаную ўзбекскай дэлегацыі, а таксама высокую арганізацыю афіцыйнага візіту. Пры гэтым спікер заўважыла, што цёплыя адносіны беларусы праяўляюць да ўсіх, хто прыбывае ў нашу краіну. Па словах Танзілы Нарбаевай, тон добрых адносін паміж Беларуссю і Узбекістанам задаюць кіраўнікі дзвюх краін. «Гэты тон імклівa расце і садзейнічае ўмацаванню, пашырэнню супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, — удакладніла яна. — Гэта і палітычны дыялог, і эканамічныя адносіны, адносіны ў сацыяльным сектары, у культурна-гуманітарным развіцці. Пачынаем узаемадзейнічаць па маладзёжнай і жаночай лініях».

Асаблівая ўвага — парламенцкаму супрацоўніцтву. «Трэба зрабіць усё, каб рэалізаваць тыя дамоўленасці, якія дасягаюцца на высокім узроўні», — адзначыла спікер верхняй палаты парламента Узбекістана.

У асобе Наталлі Качанавай Танзіла Нарбаева павіншавала беларускі народ з нагоды маючага адбыцца Дня народнага адзінства, пажадала поспехаў у рэалізацыі тых рэформаў, якія рэалізоўваюцца пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Беларусі. «Тая нацыянальная стратэгія па дасягненні ўстойлівага развіцця ўжо дае станоўчыя вынікі, па многіх паказчыках вы не тое што дагналі, а ўжо перагналі дасягненні развітых краін, — падкрэсліла спікер. — Гэта датычыцца і пытанняў медыцыны, адукацыі, грамадзянскай супольнасці, гендарнай роўнасці, партнёрства ў галіне ўстойлівага развіцця. Можна пералічваць шмат кірункаў, па якіх Беларусь смела крочыць наперад і на сусветным узроўні паказвае прыклад па павышэнні ўзроўню якасці жыцця насельніцтва. Усе рэформы — у імя дабрабыту народа, у яго інтарэсах. Дабрабыт народа — галоўны прыярытэт і дзяржаўнай палітыкі Узбекістана».

Паміж парламентарыямі дзвюх краін шмат планаў і ў заканадаўчым кірунку. Спікеры сышліся на тым, што неабходна пераймаць заканатворчы вопыт, механізм кантролю за выкананнем унутраных дакументаў, досвед дзейнасці камітэтаў, садзейнічання нізавым парламентам. Асаблівую ўвагу дамовіліся ўдзяляць рэгіёнам. «Хачу, каб наш вопыт супрацоўніцтва стаў прыкладам для многіх краін», — рэзюмавала Танзіла Нарбаева.

Спікер Сената Олій Мажліса запрасіла парламенцкую дэлегацыю Беларусі на чале з Наталляй Качанавай з афіцыйным візітам у Рэспубліку Узбекістан. У планах — правесці Другі беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум. Па завяршэнні сустрэчы Танзіла Нарбаева ўнесла запіс у Кнігу ганаровых гасцей. Таксама спікеры падпісалі Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Сенатам Олій Мажліса Узбекістана.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Захаванне міру і спакою — найважнейшае пытанне

**У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча Наталлі КАЧАНАВАЙ з членамі Каардынацыйнага савета старшыняў камітэтаў (камісій) па абароне і бяспецы парламентаў дзяржаў — членаў АДКБ пры Савеце Парламенцкай Асамблеі АДКБ.**

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што тыя пытанні, якія разглядае Каардынацыйны савет, важныя для кожнай краіны, якая з'яўляецца членам Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Па яе словах, няма сёння больш актуальных пытанняў, чым захаванне міру і спакою.

«Мы разумеем і бачым, наколькі сёння далікатны мір, — заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Ідзе геапалітычны падзел свету, аб чым калісьці казаў Прэзідэнт нашай краіны. Таму нам, парламентарыям, вельмі важна зрабіць усё для таго, каб захаваць мір і спакой у нашых краінах».

Па словах спікера, няма развіцця краіны, калі на яе тэрыторыі ідуць ваенныя дзеянні. «Самае каштоўнае для кожнай краіны, кожнага чалавека — мір і спакой, — падкрэсліла Наталля Качанава. — І мы, беларусы, гэта разумеем, як ніхто іншы. Дакладна так жа, як і вы, — тыя, хто жыве ў сяброўскіх нам краінах».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на вялікую ролю парламентарыяў па лініі АДКБ у пытанні забеспячэнні бяспекі. «Хто мог падумаць, што праз такі непрацяглы перыяд у гісторыі нашых краін мы будзем вяртацца да пытання захавання міру і спакою так востра, — канстатавала яна. — Перажылі тую страшную вайну і думалі, што вось нарэшце прыйшоў мір і мы будзем жыць, развівацца згодна са сваімі традыцыйнымі каштоўнасцямі, з тым, як выбудоўваецца палітыка ў нашых краінах. Але сёння Амерыка, калектыўны Захад робяць усё дзеля таго, каб нагнятаць канфрантацыю, ствараць правакацыйныя сітуацыі».

Па меркаванні спікера, нельга дапусціць развязвання ваенных дзеянняў на тэрыторыях дзяржаў — членаў АДКБ. «Мы бачым, як Захад разам з Амерыкай нарошчваюць ваенны кантынгент, тэхніку, — удакладніла Наталля Качанава. — Тое, што адбываецца на тэрыторыі краін, сумежных з нашай граніцай, — сведчанне таму, што гэтая істэрыя нічым і нікім не апраўданая».

Голас парламентарыяў наконт гэтых падзей, на думку спікера, павінен гучаць вельмі сур'ёзна на ўсіх пляцоўках, перш за ўсё міжнародных, для таго, каб данесці людзям праўду аб тым, што насамрэч адбываецца. Ілжывыя звесткі, паклёп — тое, што напаўняе інфармацыйную прастору заходніх краін. Аднак іх жыхары — тыя ж палякі, прыбалты, якія прыязджаюць у Беларусь, карыстаючыся бязвізавым рэжымам, — бачаць рэальныя працэсы.

«Усе добра разумеюць, што ніколі Беларусь не стаяла на шляху канфрантацыі, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Мы заўсёды казалі толькі аб міралюбівай палітыцы, якую праводзіць наша краіна. Наш Прэзідэнт шматразова кажа аб тым, што патрэбен дыялог — у імя міру і стваральнай працы. Аднак нас абвінавачваюць ва ўсіх грахах — такім чынам, апраўдваючы гонку ўзбраення, лічаць, што пагроза сыходзіць ад нашай краіны, Расіі. Гэта абсалютна не адпавядае рэчаіснасці. Мы добра разумеем, што стаіць за гэтым — страта незалежнасці і суверэнітэту, чаго мы не дапусцім ніколі».

**Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**


Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**У рамках афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі Узбекістана ў нашу краіну праходзіць I Беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум. У першы дзень форуму адбылося шэсць секцыйных пасяджэнняў, дзе прадстаўнікі бізнес-супольнасці дзвюх краін абмеркавалі шырокі спектр пытанняў: ад супрацоўніцтва ў прамысловасці і аграпрамысловым комплексе да партнёрства ў медыцыне і фармацэўтыцы. Перспектыўныя праекты паміж Беларуссю і Узбекістанам будуць рэалізаваны і ў сферах навукі, адукацыі і культуры. Вялікі ўзаемны патэнцыял бачыцца і ў турыстычнай галіне. Нашы карэспандэнты пабывалі на секцыях і даведаліся, што канкрэтна на іх абмяркоўвалася.**

# СУПРАЦОЎНІЦТВА, ЯКОЕ АДПАВЯДАЕ ІНТАРЭСАМ ДВУХ НАРОДАЎ

## Падрыхтоўка медыцынскіх кадраў, фармпрамысловасць, вытворчасць прэпаратаў крыві

**НА базе 6-й гарадской клінічнай бальніцы ў Мінску прайшло пасяджэнне секцыі Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму «Медыцына і фармацэўтыка — перспектыўныя кірункі развіцця супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Узбекістан». Удзельнікі разгледзелі актуальныя пытанні супрацоўніцтва ў галіне медыцыны і фармацэўтыкі, прыярытэтныя кірункі і перспектыўныя прагнозы развіцця медыцынскай навукі, дасягненні трансфузіялагічных службаў у абедзвюх краінах.**

Супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў медыцынскай сферы ідзе не першы год. Наша краіна ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў у медыцынскіх універсітэтах для Узбекістана, ёсць напрацоўкі і дамоўленасці па вытворчасці фармпрэпаратаў і прэпаратаў крыві. Першы беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум стане наступным крокам у развіцці гэтага супрацоўніцтва.


Фота БелТА.

— Перш за ўсё, чакаецца развіццё сувязяў у галіне арганізацыі аховы здароўя, вывучэння магчымасцяў аказання ўзаемнага садзеяння адзін аднаму ў галіне развіцця фармпрамысловасці, у прыватнасці вытворчасці прэпаратаў крыві, — расказаў **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ.**

Акрамя таго, вядуцца перагаворы аб пераймanні беларускага вопыту аказання высокатэхналагічнай дапамогі. Адным з такіх прыкладаў стала супрацоўніцтва ўзбекскага боку з МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі.

— На базе гэтага Цэнтра пастаянна праводзяцца семінары па абмене вопытам у сферы трансплантaлогіі і іншых спосабаў аказання медыцынскай дапамогі. За апошнія гады 77 грамадзянам Узбекістана была аказана медыцынская дапамога на базе МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі, — паведаміў Валерый Бельскі.

Абмеркаваны і пытанні дапамогі анкахворым дзецям.

— Што датычыцца гэтага кірунку, то сёння ў Беларусі ёсць усё, што маецца ў самых развітых краінах свету, па многіх кірунках мы займаем лідзіруючыя пазіцыі, — падкрэсліў намеснік Старшыні Савета Рэспублікі.

Ён дадаў, што ва Узбекістане прымаюцца меры па стварэнні навукова-практычных цэнтраў, якія будуць працаваць па тых жа кірунках, што і ў Беларусі. Выбудоўваецца сістэма медыцынскай дапамогі, пачынаючы ад пярвічнага звяна і заканчваючы буйнымі высокатэхналагічнымі цэнтрамі, дзе сканцэнтраваны навуковы патэнцыял і сучаснае абсталяванне. І напрацоўкі айчыннай медыцыны будуць карысныя ўзбекскаму боку. На пасяджэнні разгледжаны і пытанні арганізацыі сумеснай вытворчасці фармпрэпаратаў.

— Гэта і сумесная вытворчасць, і гандаль, і рэгістрацыя, у тым ліку размова ідзе не толькі пра беларускія прэпараты, але і тыя, што выпрабляе Узбекістан, — іх рэгістрацыю на тэрыторыі Беларусі і вытворчасць на беларускіх фармпрадпрыемствах, — удакладніў Валерый Бельскі. — Крокі, якія былі зроблены фармпрамысловасцю Беларусі ў апошнія гады пад патранатам кіраўніка дзяржавы каласальныя, і фармбяспека Беларусі забяспечана. Абмен вопытам у гэтай сферы і, самае галоўнае, таварамі, якія выкарыстоўваюцца ў медыцынскай дапамозе людзям, асабліва важныя на фоне санкцый. Мы можам і павінны мабілізаваць наш навуковы патэнцыял для таго, каб аказваць садзейнічанне адзін аднаму ў вырашэнні задач, асабліва калі ёсць узаемная цікавасць.

Тое, што супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў галіне аховы

# БЕСПІЛОТНІКІ, БІЯТЭХНАЛОГІІ, РОБАТЫ-ПАВАДЫРЫ

## Беларусь паказала Узбекістану свае навуковыя дасягненні

**Вынікі двухбаковага супрацоўніцтва і планы на будучыню ў галіне навукі і адукацыі абмеркавалі ўдзельнікі Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму падчас тэматычнай секцыі, якая прайшла на базе Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. На пачатку пасяджэння ўдзельнікам арганізавалі невялікую экскурсію па лабараторыях тэхнапарка і паказалі інтэлектуальныя здабыткі, створаныя юнымі вучонымі.**
**А напрыканцы мерапрыемства Віцебскі дзяржуніверсітэт імя Машэрава, БНТУ, Палескі і Полацкі дзяржуніверсітэты падпісалі шэраг пагадненняў са сваімі калегамі з Узбекістана.**
**У рамках дакументаў будуць развівацца, у прыватнасці, сумесныя адукацыйныя праграмы з магчымасцю выдачы двайных дыпломаў.**

### Пункты судакранання

Удзельнікі секцыі абмеркавалі найважнейшыя тэмы і кірункі супрацоўніцтва ў сферы навукі і адукацыі. У навукова-тэхнічнай сферы ўжо рэалізоўваецца шэраг праектаў, датычных аграрнай прамысловасці, нанатэхналогій у сферы фатонікі, медыцыне. Актывізацыя такіх праектаў — яшчэ адзін крок да супрацоўніцтва ў сферы навукі, а галоўнае, што гэта кансалідуе навуковыя суполкі абедзвюх краін і дае магчымасць для з'яўлення новых інавацыйных распрацовак і іх укаранення ў сферы вытворчасці Беларусі і Узбекістана, лічыць **Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— За апошнія чатыры гады ў беларускіх ВНУ ў разы павялічылася колькасць навучэнцаў з Узбекістана. Аднак перспектывы супрацоўніцтва бачацца не толькі ў сферы вышэйшай адукацыі, але і ў сістэме дадатковай адукацыі для дзяцей і моладзі. У будучыні, магчыма, з'явяцца новыя спецыяльнасці, якія будуць цікавыя для нашых краін. Яшчэ адзін кірунак супрацоўніцтва дзяржаў — маладзёжная палітыка. Нашы краіны не проста захавалі гістарычную повязь і памяць, але і здолелі павялічыць колькасць праектаў, якія ў тым ліку ўплываюць на эканоміку нашых краін і дабрабыт людзей. Наш форум стане добрым стартам і для сумеснай работы маладзёжных парламентарыяў.



Жанчына ў нашай краіне і ў свеце — увасабленне міру і стварэння. Жанчына — гэта маці, радзіма, сям'я, дзеці, таму ў нас шмат агульных пунктаў судакранання: жыццёвых, чалавечых, важных. І калі з іх пачынаць размову, яна абавязкова скончыцца добрымі пазітыўнымі рашэннямі і далейшай работай сумеснымі намаганнямі, а прынятыя рашэнні будуць рэалізоўвацца, дадала сенатар.

На постсавецкай і нават сусветнай прасторы Беларусь зрабіла вялікі крок у многіх сферах, у тым ліку ў навуковай і адукацыйнай. Сумесную цікавасць адзін да аднаго ў гэтых галінах праяўляюць абедзве краіны, а Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк — гэта фабрыка раскрыцця талентаў, заўважыў, гаворачы пра даўняе супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана, **Аляксандр БАХАНОВІЧ, першы намеснік міністра адукацыі:**

— Паміж універсітэтамі нашых краін заключана некалькі соцень прамых дагавораў аб супрацоўніцтве, у рамках якіх адбываюцца сумесныя адукацыйныя праграмы, абмен студэнтамі і выкладчыкамі. Выконваецца і шэраг сумесных навуковых праектаў, абменьваемся аспірантамі і дактарантамі, вучонымі. У заключаных падчас работы секцыі пагадненнях прапісаны магчымасці ўзаемных стажыровак, наведванняў універсітэтаў, правядзенне сумесных навуковых канферэнцый і шэраг мерапрыемстваў у частцы выхаваўчай работы і стасункаў студэнтаў і выкладчыкаў. Мы плануем распрацоўваць бізнес-праекты і прапаноўваць іх нашай прамысловасці і прадпрыемствам рэальнай эканомікі.

### Дзіцячыя ідэі — сёння, інавацыйны прадукт — заўтра

Навучэнцы тэхнапарка сёння прапаноўваюць мноства ідэй, якія ўжо цяпер можна рэалізоўваць у якасці канкрэтных праектаў і дакладных інавацыйных прадуктаў, упэўнены спецыялісты.

Сачыць за эмацыянальным станам супрацоўнікаў, каб папярэдзіць іх эмацыянальнае выгаранне, можна, напрыклад,

здароўя адпавядае інтарэсам двух народаў, адзначыў і **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Юрый ДЗЕРКАЧ.**

— Безумоўна, тое паспяховае супрацоўніцтва, якое наладзілася, асабліва ў апошнія гады, поўнасцю адпавядае інтарэсам нашых народаў. Гэтыя дасягненні, несумненна, рэалізаваны дзякуючы палітычнай волі лідараў нашых дзяржаў, накіраванай на ўсялякае ўмацаванне шматпланавага супрацоўніцтва абедзвюх краін, — адзначыў Юрый Дзеркач.

Паводле яго слоў, паміж установамі аховы здароўя і медыцынскай адукацыі Беларусі і Узбекістана наладжаны прамыя кантакты. Для развіцця супрацоўніцтва заключаны шэраг пагадненняў, рэалізоўваецца праграма акадэмічнай мабільнасці студэнтаў і выкладчыкаў. Праходзяць стажыроўкі на базах устаноў аховы здароўя.

Як адзначыў **рэктар Самаркандскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Жасур РЫЗАЕЎ,** за апошнія гады ў Беларусі і Узбекістане прымаюцца шырокамаштабныя меры па ўдасканаленні сістэм адукацыі, аховы здароўя, па паляпшэнні ўзроўню жыцця грамадзян. Што да аховы здароўя, ён заўважыў: узровень яго развіцця вызначаецца наяўнасцю і выкарыстаннем у лячэбных установах новых і найноўшых медыцынскіх прыбораў, сістэм і медыцынскіх тэхналогій.

— Мы сёння бачым дасягненні навукі і адукацыі, медыцыны і фармацэўтычнай галіны Беларусі. І гэта адкрывае вялікія магчымасці ў сферы супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, — сказаў Жасур Рызаеў.

Больш падрабязна пра супрацоўніцтва, якое ўжо наладжана, расказала **першы намеснік міністра аховы здароўя Алена КРАТКОВА.** Пачатак новаму этапу ўзаемаадносін быў пакладзены роўна пяць гадоў таму. У верасні 2018 года падпісана пагадненне паміж міністэрствамі аховы здароўя дзвюх краін. Распрацаваны і зацверджаны 2 лістапада 2018 года прэм'ер-міністрамі дзвюх краін і сёння паспяхова рэалізоўваецца План мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва.

Прыярытэтнымі з'яўляюцца чатыры кірункі, і першы — медыцынская адукацыя. Напрыклад, цеснае супрацоўніцтва наладжана паміж Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам і Андыжанскім дзяржаўным медыцынскім інстытутам, Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам і Бухарскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам. Працягваецца супрацоўніцтва паміж БелМАПА і Ташкенцкай медыцынскай акадэміяй і Ташкенцкім стаматалагічным інстытутам.

— Другі кірунак — узаемаадносіны паміж установамі аховы здароўя. У 2022 годзе ў РНПЦ «Маці і дзіця» праведзена навучанне чатырох урачоў-неанатолагаў з Узбекістана па тэматыцы «Арганізацыя аказання высокатэхналагічнай дапамогі нованароджаным ва ўмовах аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі». У 2023 годзе навучана 18 спецыялістаў з Узбекістана. Перспектыва — больш за сто супрацоўнікаў, нашых калег з Узбекістана, — адзначыла Алена Краткова.

Што датычыцца фармацэўтыкі, размова ідзе аб сумеснай вытворчасці лекавых прэпаратаў, імпарце прэпаратаў з Узбекістана і экспарце беларускіх прэпаратаў. У 2022 годзе экспарт прадукцыі арганізацый — удзельніц холдынга «Белфармпрам» ва Узбекістан склаў 1,5 мільёна долараў. У студзені — маі 2023 года ва Узбекістан экспартавана прадукцыі на суму 1,6 мільёна. Яшчэ адзін кірунак — развіццё трансфузійнай дапамогі, а таксама вытворчасць прэпаратаў з плазмы крыві.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

з дапамогай сістэмы, распрацаванай адным з навучэнцаў, лічаць у тэхнапарку. Ідэя праекта ў тым, што па фота сістэма з дапамогай нейрасеткі аналізуе эмоцыі чалавека. Госці з Узбекістана прапанавалі выкарыстоўваць такую сістэму падчас дэгустацыі ў харчовай прамысловасці.

А робат-павадыр, да якога прымацавана спецыяльная палка, прапанаваны адным з вучняў лабараторыі, дзе займаюцца робататэхнікай, можа суправаджаць невідушчых людзей, бо здольны спыняцца перад перашкодай. Яшчэ адна цікавая ідэя датычыцца ўдасканальвання сістэмы ацяплення БелАЭС, аўтар якой **Лізавета Статкевіч, 10-класніца з Ліды.** Яна з дапамогай сур'ёзных разлікаў удасканаліла работу рэальнай цеплавой схемы на станцыі, якая дазволіць зменшыць цепластраты. Пакуль у тэорыі, але мяркуецца, што яе праект прадставяць на БелАЭС і прымуць да ведама.

— Усе разлікі робяцца датычна рэальных аб'ектаў з выкарыстаннем рэальных лічбаў і схем, і яны могуць выкарыстоўвацца на практыцы, — заўважыла **Таццяна ПЯТРОЎСКАЯ, старшы выкладчык кафедры прамысловай энергетыкі і цеплатэхнікі БНТУ.** — Напрыклад, вучні прааналізавалі сусветны вопыт выкарыстання сонечных панэляў, узялі найлепшае, сабралі і прапанавалі нашаму прадпрыемству МАЗ для электробусаў з улікам выкарыстання ў беларускім клімаце. Часам праекты нашых вучняў больш складаныя, чым дыпломныя работы студэнтаў.

Працуюць і ў лабараторыі авіякасмічных тэхналогій тэхнапарка. Частка заняткаў адбываецца на базе Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, дзе хлопцы і дзяўчаты вывучаюць, як уладкаваны і працуюць беспілотныя лятальныя апараты. А ў канцы навучання ўсе яны ўмеюць кіраваць беспілотнікамі.

Ідэі і прадукты, зробленыя ўласнымі рукамі дзяцей, вельмі актуальныя і запатрабаваныя, таму што гэтыя рашэнні адразу можна прымяняць на практыцы, падзяліўся ўражаннямі ад убачанага **Мацёкуб БАКОЕЎ, акадэмічны дырэктар ташкенцкага філіяла Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін (універсітэта) МУС Расіі:**

— Урад Узбекістана таксама ўдзяляе вялікую ўвагу стварэнню тэхнапаркаў ва ўсіх рэгіёнах, аднак у нас не хапае кадраў, якія маглі б рыхтаваць дзяцей. Мы будзем абавязкова супрацоўнічаць з беларускім Нацыянальным дзіцячым тэхнапаркам адносна атрымання вопыту методыкі, а таксама з тэхуніверсітэтамі — для наладжвання сувязі.

Практычна ўсе новыя галіны, якія ствараюцца ў Беларусі — робататэхніка, нана- і біятэхналогіі, штучны інтэлект — цікавяць узбекскі бок. Беларусы ў сваю чаргу гатовыя дзяліцца сваім вопытам і ўзаемаўзбагачаць адзін аднаго, а таксама вучыць грамадзян Узбекістана і павышаць кваліфікацыю прафесарска-выкладчыцкага складу ў беларускіх універсітэтах.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# БУДЗЕМ ШЫЦЬ ДРУЖНА

## І Беларуска-ўзбекскі жаночы форум даў прадпрыемствам лёгкай прамысловасці абедзвюх краін магутны імпульс да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва

**Не сакрэт, што лёгкая прамысловасць — тая сфера, у якой у асноўным працуюць жанчыны. І спрадвеку менавіта жанчына ва ўсім свеце сімвалізуе стваральны пачатак. Добрасуседства, супрацоўніцтва, імкненне зрабіць жыццё больш камфортным і ўтульным — усё гэта ўласціва прыгожай палове чалавецтва. У гэтым яшчэ раз можна было пераканацца, наведаўшы пасяджэнне секцыі «Перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва ў сферы лёгкай прамысловасці» ў рамках І Беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму.**

Аснову беларускага экспарту ва Узбекістан складаюць малочная прадукцыя, тавары з дрэва, нафтапрадукты, фармацэўтычныя прэпараты, трактары і седлавыя цягачы. У Беларусь з Узбекістана імпартуецца гародніна, садавіна, бавоўняная пража, металапрадукцыя. І, вядома,



Фота БелТА.

асаблівай любоўю ў беларускіх грамадзян карыстаецца ўзбекскі тэкстыль.

Важна развіваць не толькі гандлёвыя зносіны, але і рэалізоўваць сумесныя праекты, ствараць сумесныя прадпрыемствы, наладжваць кааперацыйныя сувязі, падкрэсліла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ.**

## Стратэгія поспеху

— Плануем падпісанне кантрактаў мінімум на 2,5 млн долараў, — распавяла **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА.** — Гэта кантракты як на пастаўку з Узбекістана некаторых таварных пазіцый у нашу краіну, так і на пастаўку з нашага боку ва Узбекістан тэкстыльнай прадукцыі — таго ж «Магатэкса», «Аршанскага льнокамбіната». Цешаць кантракты, якія мы заключаем па прамкааперацыі. Напрыклад, кантракт з узбекскімі партнёрамі «Світанка» і «Калінкі»: калі мы ўзаемадзейнічаем прамысловымі ўчасткамі, забяспечваючы працай адзін аднаго.

Беларуская лёгкая прамысловасць заматывавана на доўгую плённую работу з узбекскімі калегамі, падкрэсліла кіраўнік канцэрна «Беллегпрам».

— Мы сапраўды блізкія з узбекскімі асацыяцыямі, якія спецыялізуюцца на вытворчасці тэкстылю і гарбарна-абутковай прадукцыі, у нас даўнія сувязі. Так павялося, што мы дзесяцігоддзямі карыстаемся сыравіннымі магчымасцямі, паўфабрыкатамі нашых узбекскіх партнёраў і калег. Але сёння ёсць ужо прыклады менавіта вытворчай кааперацыі. Мы разумеем, што адным з моцных бакоў узбекскай лёгкай прамысловасці з'яўляецца іх працоўны патэнцыял, іх кампетэнцыі, якія яны здолелі нарасціць за апошнія пяць гадоў, і, вядома, уступаем у вытворча-інтэграцыйныя сувязі. Многія беларускія прадпрыемствы пад сваімі гандлёвымі маркамі і брэндамі, са сваімі дызайнерскімі рашэннямі і канструктарска-тэхналагічнай дакументацыяй размяшчаюць заказы на ўзбекскіх прадпрыемствах, і гэты бізнес будуецца даволі паспяхова. І Беларусі ёсць што прапанаваць узбекскай лёгкай прамысловасці. Карыстаюцца папулярнасцю нашы бавоўнапаліэфірныя тканіны, запатрабаваны ваўняныя тканіны, ільняныя. Пазіцыі нашых калег з канцэрна «Белнафтахім» па поліэфірных нітках таксама запатрабаваны сёння ў лёгкай прамысловасці Узбекістана.

Асобны пласт узаемадзеяння — гарбарна-абутковая галіна, адзначыла Таццяна Лугіна. Паспяхова працуе сумеснае прадпрыемства, якое ў 2018 годзе адкрыў ва Узбекістане гарбарна-абутковы холдынг «Марка». У перспектыве «Марка» плануе таксама сумеснае прадпрыемства па перапрацоўцы аўчыны і каракульчы.

— Пунктаў росту шмат, — адзначае Таццяна Лугіна. — І галоўнае, што мы разумеем адзін аднаго з паўслова, — настолькі ў нас цесныя ўзаемаадносіны з узбекскімі партнёрамі. Таму трэба нарошчваць патэнцыял, і я ўпэўнена, што існуючы аб'ём тавараабароту і ўзаемаадносін у рамках лёгкай прамысловасці — гэта яшчэ не мяжа. Пераканана, што форум зблізіць нашы пазіцыі і дасць штуршок да нарошчвання тавараабароту, абмену кампетэнцыямі і вопытам.

## Мэты і перспектывы

Работа секцыі, прысвечанай пытанням супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў галіне лёгкай прамысловасці, пачалася з экскурсіі ўзбекскіх гасцей у цэхі знакамітага беларускага прадпрыемства «Камволь», па выніках якой, у прыватнасці, быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж дызайн-цэнтрамі ААТ «Камволь» і Асацыяцыі «Узтэкстыльпрам». Потым прафесіяналы тэкстыльнай і гарбарнай галін абедзвюх краін, дэлегацыі ўзбекскіх прадпрыемстваў па пашыве спецадзення, бялізнавага трыкатажу, дзіцячага адзення, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, члены Маладзёжнай палаты пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва ў ходзе круглага стала.

Нашы краіны — найважнейшыя стратэгічныя партнёры адна для адной, адзначалі госці. І лёгкай прамысловасці абедзвюх краін ёсць чым падзяліцца.

— З першага дня работы форуму ў нас ужо ёсць некалькі дагавораў і пагадненняў, — падкрэсліла **дарадца па гендарнай роўнасці і развіцці дызайну Асацыяцыі «Узтэкстыльпрам» Камала ГУЛЯМАВА.** Яна расказала, што за 6 апошніх гадоў тэкстыльная галіна яе краіны дабілася ўражлівых поспехаў.

— Важным нашым дасягненнем стала стапрацэнтная перапрацоўка бавоўнянага валакна і паказчык экспарту тэкстыльнай прадукцыі ў 3,2 млрд долараў. Цяпер наша мэта — павялічыць штогадовы экспарт да 10 млрд долараў у 2027 годзе.

Высокіх вынікаў у апошнія гады дасягнула і абутковая галіна лёгкай прамысловасці Узбекістана.

— Калі ў 2018 годзе ў нас было каля 70 прадпрыемстваў гарбарна-абутковай галіны, то на сёння іх больш за 2 тысячы, — сказала **Длабар ЗУФАРАВА, начальнік аддзела прагназавання і эканамічнага аналізу Асацыяцыі «Узчармсанаат».** — Адзін з прыкладаў паспяховага супрацоўніцтва з беларускімі калегамі — адкрыццё сумеснага прадпрыемства «Узшуз». І, я думаю, гэта толькі першая ластаўка. У нас з беларускімі калегамі вельмі шмат тэм, якія можна прапрацаваць.

— За два няпоўныя гады работы прадпрыемства «Узшуз» выраблена каля 180 тысяч пар абутку, — распавёў **генеральны дырэктар ТАА «Кіруючая кампанія холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» Мікалай МАРТЫНАЎ.** — У далейшым прадпрыемства выйдзе на праектныя магутнасці 570 тысяч пар абутку ў год.

Гэта прыклад узаемавыгаднага супрацоўніцтва, падкрэсліваюць спецыялісты. Беларускі бок перадае кампетэнцыі па тэхналогіях вытворчасці абутку, патэнцыял узбекскага боку — у сыравіннай базе і працоўных рэсурсах.

Вынікам работы секцыі «Перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва ў сферы лёгкай прамысловасці» І Беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму стала падпісанне шэрагу кантрактаў, а таксама пратакола аб намерах стварэння сумеснага прадпрыемства па вырабе аўчынна-футравай, каракулева-смушкавай і пушна-футравай сыравіны.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ МАГАЗІН І АЎТАКРАМА

## Прэзідыум райсавета разглядаў пытанні арганізацыі гандлю на Ружаншчыне з улікам грамадскай думкі

**Выязное пасяджэнне прэзідыума Пружанскага раённага Савета дэпутатаў у мінулым месяцы разгледзела стан гандлёвага і бытавога абслугоўвання насельніцтва Ружанскага сельсавета. На нарадзе прысутнічалі члены прэзідыума райсавета, старшыні ўсіх сельвыканкамаў раёна, кіраўнікі арганізацый, адказных за абслугоўванне.**



Варта сказаць, што Ружаны — не шараговы населены пункт. У Ружанах знаходзіцца адна з галоўных славутасцяў не толькі вобласці, але і краіны. За мінулы год, напрыклад, музейны комплекс палаца Сапегаў наведала каля 30 тысяч чалавек. Турысты — гэта яшчэ і патэнцыяльныя пакупнікі магазінаў, а таксама наведвальнікі прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Да таго ж Ружаны — транзітны пасёлак, праз які праходзяць дарогі на Слонім, Ваўкавыск, Івацэвічы. Гэтыя фактары, несумненна, мелі на ўвазе спецыялісты пры падрыхтоўцы пытання да разгляду прэзідыума. Яшчэ адзін блок праблем, што вывучаўся, датычыўся абслугоўвання жыхароў невялікіх населеных пунктаў у ваколіцах пасёлка. Іх меркаванне таксама ўлічвалі.

Як расказала карэспандэнту «МС» **старшыня Ружанскага сельскага Савета Аксана ЮРКОЎСКАЯ**, падрабязнаму агляду гандлю і бытавога абслугоўвання, якім стала выязное пасяджэнне, папярэднічала вялікая работа па вывучэнні стану спраў і грамадскай думкі. Выбарачнае апытанне жыхароў правялі карэспандэнты пружанскай газеты «Раённыя будні». Маніторынг грамадскай думкі ружанцаў пры дапамозе анкетавання арганізаваў аддзел ідэалагічнай работы і па справах моладзі райвыканкама. У анкетаванні, напрыклад, узялі ўдзел 58 працуючых грамадзян і дзесяць пенсіянераў. Вынікі маніторынгу, які стаў своеасаблівым зрэзам грамадскай думкі жыхароў пасёлка, агучылі на пасяджэнні.

З жыхарамі малых населеных пунктаў таксама пагутарылі напярэдадні карэспандэнты «раёнкі», — адзначыла Аксана Уладзіміраўна. — У асноўным меркаваннем дзяліліся старасты вёсак. І гэта было, несумненна, цікава. Звычайна людзі не выказваюць захаплення ад таго, што магазіны ў іх закрылі. Аб гэтым, напрыклад, гаварыў жыхар вёскі Далкі. Апошнім часам жыхары Далкоў хадзілі ў краму ў Ласасін, але і яе закрылі. І самі ласасінцы, як выглядае, яшчэ не прывыклі да абслугоўвання аўтакрамай.

А вось стараста названай вёскі Валянціна Паляшук работу аўтакрамы ацэньвае станоўча. На думку старасты, асартымент гандлёвага пункта на колах даволі разнастайны, таксама прывозяць прадукцыю па папярэдніх заяўках. Акрамя таго, у вёску амаль кожны дзень заходзіць паштовая машына, якая возіць у тым ліку і прадукты.

Паводле слоў Тацццяны Юдчыц, старасты адразу чатырох малых населеных пунктаў — Загалічаў, Далкоў, Навасадаў, Бярэзніцы, — у вёсках засталіся ў асноўным пенсіянеры, ім не складана падстроіцца пад графік аўтакрамы, якая прыязджае два разы на тыдзень. А яшчэ сельгаспрадпрыемства «Ружаны-Агра» прыкладна раз на месяц прывозіць у вёскі сваю мясную прадукцыю. Стараста дамаўляецца з гаспадаркай, узгадняе графік і апавяшчае людзей. Напрыклад, за адзін толькі ліпень гаспадарка прадала прадукцыі амаль на 1800 рублёў. Гэта надзвычай выгадна і зручна.

Старасты вёсак Шчытна, Верчыцы, Астравок, Воля і Карасі ніякіх нараканняў на работу аўтакрамы не агучылі. А вось у Поланску, дзе працуе магазін, людзі выказалі шэраг крытычных заўваг. У некаторых вёсках людзі незадаволеныя тымі аўтакрамамі, дзе няма тэрміналаў, адпаведна, няма магчымасці разлічыцца карткай. Гэта асабліва актуальна летам, калі да вяскоўцаў прыязджаюць гарадскія дзеці і ўнукі.

Апытанне праводзілася сярод розных сацыяльных катэгорый насельніцтва. Гандлем прадуктовай груп тавараў людзі ў асноўным задаволеныя. Амаль у адзін голас усе ўхвалілі факт адкрыцця фірменнага магазіна Бярозаўскага мясакамбіната, дзе пакупнік можа набыць надзвычай разнастайную прадукцыю. А ружанскія гаспадыні даўно ацанілі магчымасці закупляцца ў сталоўцы ААТ «Ружаны-Агра». Там прадаецца ўласная мясная прадукцыя, паўфабрыкаты. Асабліва зручна бывае пасля работы набыць нешта з паўфабрыкатаў, каб хутка прыгатаваць вячэру, тым больш выбар у сталоўцы заўсёды прыстойны. Людзі выказалі прапанову адкрыць уласны магазін гаспадаркі «Ружаны-Агра». Дарэчы, такі маецца ў райцэнтры суседняй вобласці — Слоніме.



Некаторыя з пенсіянераў наракалі на гандаль прамысловай групай тавараў. Паводле іх меркавання, не заўсёды на месцы можна купіць недарагія адзенне, абутак, прадметы быту. Да бытавога абслугоўвання таксама ёсць пытанні. Рамонт абутку і адзення даступны толькі ў райцэнтры альбо суседнім Слоніме.

— Работа выязнога пасяджэння пачалася з наведвання гандлёвых пунктаў, — расказала старшыня сельвыканкама Аксана Юркоўская. — Найперш зазірнулі ў магазін «Востраў чысціні і смаку», які адкрылі два гады таму. У дзень тут бывае да трохсот пакупнікоў, але гандлёвае прадпрыемства сутыкнулася з кадравай праблемай. Падобныя цяжкасці, дарэчы, адчуваюць і ў іншых магазінах.

У магазіне райспажыўтаварыства парадаваў асартымент, а таксама прасторная зала, зручнае размяшчэнне тавараў. Як расказалі работнікі, на паліцах — 85 працэнтаў прадукцыі беларускай вытворчасці, у тым ліку з прадпрыемстваў Брэсцкай вобласці, дзейнічаюць акцыі і зніжкі. У новым магазіне Бярозаўскага мясакансервавага камбіната «Мясны свет» вока радавала разнастайнасць асартыменту.

Пабывалі ўдзельнікі нарады і ў комплексным прыёмным пункце бытавога абслугоўвання, бо ў ходзе маніторынгу грамадскай думкі жыхары выказалі шэраг заўваг і пажаданняў мясцовай «бытоўцы». Гаварылі, напрыклад, пра мэтазгоднасць пастаяннай работы цырульніка. Высветлілася, што ў пункце КБА чатыры дні ў тыдзень працуе мясцовы майстар, а па серадах цырульнік прыязджае з райцэнтра. Ну а каму патрабуецца тэрміновая альбо святочная прычоска, то ёсць магчымасць скарыстацца салонам прыгажосці, які працуе ў санаторыі «Ружанскі». Прыёмны пункт бярэ заказы на мэблю, аказвае рытуальныя паслугі. Варта ўдакладніць, што гэты пункт цяпер адзіны на ўсю Ружаншчыну.

На пленарным пасяджэнні прагучалі актуальныя лічбы. Аказваецца, забяспечанасць гандлёвымі плошчамі па сельсавеце складае 866,69 метра квадратнага на тысячу жыхароў. Для параўнання — у цэлым па раёне гэтая лічба складае 812,71. Сацыяльныя стандарты выконваюцца. Больш за 63,5 працэнта насельніцтва сельсавета пражывае ў Ружанах, з тае прычыны тут сканцэнтраваная большасць гандлёвых аб'ектаў. Аўтакрамы абслугоўваюць 22 вёскі сельсавета. Таксама на тэрыторыі функцыянуюць дзве сталоўкі «Ружаны-Агра», чатыры аддзяленні РУП «Белпошта», кафэ «Ружанка», кафетэрый на аўтазаправачнай станцыі.

Дарэчы, пра недастатковасць аб'ектаў грамадскага харчавання выказалася больш за палову ўдзельнікаў анкетавання. І тут напрошваецца высnova, што Ружанам у дадзеным сэнсе не хапае прыватнай ініцыятывы. Скажам, свежай выпечкай, па якой засумавалі некаторыя ўдзельнікі згаданага маніторынгу, мог бы заняцца індывідуальны прадпрымальнік-кандытар. Як, напрыклад, у невялікім гарадку Высокае Камянецкага раёна. Там у павільёне мясцовай пякарні няредка стаіць чарга, настолькі ўсё свежае і смачнае прапануюць кожную раніцу. Рамонт абутку, адзення цяпер цалкам у руках прыватнікаў, нават у вялікіх гарадах. Прадпрымальнікі маглі б вырашыць і праблему гандлю даступнымі прамысловымі таварамі, пра якую згадвалі пенсіянеры.

**Старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Мікалай КУДРАВЕЦ:**

— У цэлым гандлёвае абслугоўванне жыхароў Ружанскага сельсавета арганізаванае добра. На пасяджэнні намі зроблена выснова, што насельніцтва забяспечана таварамі першай неабходнасці, штодзённага попыту, а таксама гандлем рознай спецыялізаванай накіраванасці. Падрыхтоўка да выязнога пасяджэння, яго правядзенне сталі своеасаблівымі агледзінамі, якія выявілі пэўныя недахопы. Былі дадзены канкрэтныя даручэнні, яны аператыўна выконваюцца. Мы ўбачылі шляхі развіцця і паляпшэння, у іх ліку стымуляцыя той жа прыватнай ініцыятывы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Ружанскага сельсавета і з адкрытых крыніц.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.384. Нумар падпісаны ў 19.30 5 верасня 2023 года.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование |
|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 330/С-33528,** расположенное по адресу: г. Мозырь, ул. Саета Г.Е., 4. Общая площадь: 738,7 кв. м. Наименование: здание банка. Назначение: здание специализированное финансового назначения |

**Начальная цена продажи** – 980 949,52 бел. руб. с учетом НДС

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 (десять) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 09.10.2023 начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 06.10.2023 г. до 15.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; E-mail: e.pinchuk@iin.by** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Житковичский моторостроительный завод», Гомельская обл., г. Житковичи. УНП 400049955 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 **(www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов** – оборудование, бывшее в употреблении. Местонахождение: Гомельская обл., г. Житковичи

| Лот, № | Наименование | Инв. № | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Станок вертикально-фрезерный FGSV-56** | ВФ-5 | **15 360,00** |
| 2 | **Станок резьбонакатной UPW1251** | НР-349 | **7 440,00** |
| 3 | **Станок резьбонакатной UPW8** | НР-350 | **11 520,00** |
| 4 | **Станок токарно-винторезный ИЖ-250П** | ТВ-224 | **3 720,00** |

**Условия торгов:** демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** после проведения торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 6 % от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 09.10.2023 в 11.00. Окончание торгов: 09.10.2023 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 06.10.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в деревне Беседы, деревне Рудня Слободского сельсовета Лепельского района Витебской области

**Организатор: Слободской сельский исполнительный комитет Лепельского района Витебской области**

| Лот | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, рублей | Начальная цена, рублей | Сумма задатка, рублей (10 %) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Витебская область, Лепельский район, Слободской с/с, д. Беседы, ул. Центральная, 1Е, (У-1) площадь – 0,1839 га, кадастровый номер 222783301101000071 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения | Земельный участок, расположенный в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, код 7,1, площадь – 0,1839 га | **4330,59** | **5500,00** | **550,00** |
| 2 | Витебская область, Лепельский район, Слободской с/с, д. Рудня, ул. Центральная, 28А, (У-9) площадь – 0,1493 га, кадастровый номер 222783307101000045 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения | Земельный участок, расположенный на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код 2,4, площадь – 0,1493 га | **3970,49** | **5000,00** | **500,00** |

1. Аукцион состоится **09.10.2023 года в 14.30** по адресу: Витебская область, Лепельский район, аг. Слобода, ул. Молодежная, 27Б.

2. Регистрация участников по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский район, аг. Слобода, ул. Молодежная, д. 27Б. **Последний день приема заявлений – 02 октября 2023 года до 17.00.**

УНП 300039227

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – Частного торгово-производственного унитарного предприятия «ИНСТИТУТ ЭНЕРГОСБЕРПРОЕКТ»
(УНП 600126325, Минская обл., г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36).

***Дата и время проведения торгов:* 19 сентября 2023 года.** Начало – 10.00. Заявки принимаются с 06 сентября 2023 года по 15 сентября 2023 года.
***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
*Продавец:* **Частное торгово-производственное унитарное предприятие «ИНСТИТУТ ЭНЕРГОСБЕРПРОЕКТ»** (УНП 600126325), в лице ликвидатора – директора ООО «АзимутКонсалт» Радченко К.И., тел. 8 (029) 156-86-96.

| № лота | Наименование лота | Кол-во, шт. | Начальная цена руб., без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 610/С-44730, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36, площадь – 1757,60 кв. м, назначение – административное здание, наименование – административное здание (свидетельство (удостоверение) № 610/724-1914 о государственной регистрации) | 1 | 132 300,00 | 5 % | 2 % |
| | Сведение о земельном участке: кадастровый номер 620850100008000910, площадь – 0,3538 га, назначение – земельный участок для обслуживания и эксплуатации административного здания (свидетельство (удостоверение) № 610/724-1913 о государственной регистрации), принадлежит на праве постоянного пользования | | | | |
| | Иные сведения: на дату проведения торгов имеется ограничение – действующие договоры аренды | | | | |

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 16.00 **15 сентября 2023 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 15.09.2023 заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в редакции постановления Совмина от 12.07.2013 № 607), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение об оплате вознаграждения организатора торгов.

**Место приема заявлений – г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406.**

**Телефон для ознакомления и осмотра лота +375 29 684 71 76, Яскевич Дмитрий Васильевич.**

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Шаг торгов 5 % от начальной цены лота. Задаток за участие в торгах 2 % от начальной цены лота.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 (три) дня до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился только один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен продавцом.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 150 (30030) за 05.08.2023.

## Информация о проведении аукциона (далее – Аукцион)
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в **д. Заброденье, д. Осово, Белая Лужа** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Аукцион состоится **10 октября 2023 г. в 15.00** в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д 3, кабинет № 1.

*Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Заброденье** | 624881706101000104 | 0,15 га | (1 09 02) земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 6 000,00 |
| 2 | **д. Осово, ул. Горького** | 624881710301000046 | 0,1496 га | | 6 000,00 |
| 3 | **д. Белая Лужа** | 624881701601000142 | 0,15 га | | 7 000,00 |

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Смолевичского райисполкома: http://www.smolevichi.gov.by.

УНП 600023532

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Псіхалогія для ўсіх

# НЕДАСТАТКОВА ДОБРЫ

## Як перамагчы няўпэўненасць у сабе

**Наўрад ці знойдзецца чалавек, які ні разу не сутыкаўся з новымі сітуацыямі, якія бянтэжаць. Таму адчуваць сябе няўпэўнена час ад часу зусім нармальна. Але што рабіць, калі вы ўвесь час знаходзіцеся ў гэтым стане і гэта моцна замінае вам жыць? Як справіцца з няўпэўненасцю, расказвае ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Марына ШЧАСЛЯНОК.**

### БОЯЗЬ БЫЦЬ САБОЙ

Па вялікім рахунку, няўпэўненасць у сабе — гэта страх быць сабой. Ён уключае шмат розных праяў, але сутнасць застаецца нязменнай: чалавек вельмі баіцца паказваць сапраўдныя пачуцці і праяўляць сваю індывідуальнасць. Гэта наўпрост звязана з жаданнем быць любімым і атрымаць прызнанне, што ў прынцыпе ўласціва ўсім людзям.

Аднак няўпэўненага ў сабе чалавека адрознівае глыбокая вера ў тое, што такога, як ён, ніхто не палюбіць. Што ён дрэнны, нявартны і няўдачлівы. Выяўляцца гэта можа ў рознай ступені і ў розных сферах жыцця, але заўсёды вельмі перашкаджае чалавеку быць шчаслівым і рэалізоўваць свой патэнцыял. Таму вельмі важна разабрацца з асноўнымі прыкметамі і прычынамі няўпэўненасці ў сабе, а таксама асвоіць спосабы пераадолення.

### ПРЫКМЕТЫ НЯЎПЭЎНЕНАСЦІ

Калі чалавек балбоча без перапынку, увесь час круціцца на крэсле і мітусіцца, ён відавочна пачуваецца няўпэўнена і спрабуе гэта схаваць, паказаць сябе актыўным і таварыскім. Спакой і ўпэўненасць, наадварот, заўсёды праяўляюцца ў размеранай гаворцы і адсутнасці рэзкіх рухаў. Тут важна не зблытаць няўпэўненасць і актыўны тэмперамент: халерыкі, напрыклад, таксама могуць гаварыць хутка і актыўна жэстыкуляваць, але пры гэтым яны не мітусяцца. Таксама няўпэўненага ў сабе чалавека выдаюць скаваныя рухі, сутулыя плечы і згорбленая постаць: ён нібы жадае знікнуць, каб толькі не прыцягнуць лішняй увагі.

Здавалася б, заўважыць няўпэўненасць чалавека вельмі лёгка, і для гэтага не трэба выдзяляць нейкія спецыяльныя прыкметы. Аднак на справе гэта далёка не заўжды так. Напрыклад, калі чалавек пазбягае быць у цэнтры ўвагі, гэта яшчэ не значыць, што ён сарамлівы. Магчыма, ён проста інтраверт і любіць адзіноту. Агрэсіўныя ж ці занадта дэманстратыўныя паводзіны, наадварот, могуць казаць аб жаданні схаваць свае страхі.

**Параўнанне сябе з іншымі:** няўпэўненасць жанчыны выяўляецца ў тым, што яна лічыць сябе менш прывабнай, чым яе сяброўкі. Таму ў іх кампаніі яна маўчыць і імкнецца быць незаўважнай. Няўпэўненасць мужчыны можа выяўляцца ў тым, што ён пускае пыл у вочы і раскідаецца грашамі. Або, наадварот, кажа, як яму не пашчасціла з працай у адрозненне ад суседа ці старога сябра. Прынцып тут заўсёды адзін: у няўпэўненага ў сабе чалавека амаль заўсёды параўнанне з іншымі аказваецца не на яго карысць.

**Пазбяганне ініцыятывы і адказнасці:** «Мне ўсё роўна», «рабі як хочаш» — тыповыя фразы няўпэўненага ў сабе чалавека. Справа не ў тым, што ў яго няма сваіх жаданняў і перавагаў, проста ён баіцца заяўляць аб іх і не жадае браць на сябе адказнасць.



**Няўменне адмаўляць:** няўпэўнены ў сабе чалавек з цяжкасцю кажа «не» і часта паступаецца сваімі жаданнямі дзеля інтарэсаў іншых. Ён гатовы ўсё кінуць, адкласці свае планы і прымчацца на іншы канец горада, калі папрасілі аб дапамозе. Што ім рухае? Зусім не жаданне дапамагчы. Насамрэч такія людзі баяцца кагосьці пакрыўдзіць ці выглядаць эгаістамі. Пры гэтым яны могуць гадамі трываць эгаістычныя і наплявацьскія адносіны да сябе — абы не выклікаць асуджэнне іншых людзей.

**Напышлівыя паводзіны:** у гэта складана паверыць, але фанабэрыстасць — відавочная прыкмета няўпэўненасці ў сабе. Калі чалавек сам сцвярджаецца за кошт іншых, ён такім спосабам спрабуе пераадолець комплекс няўпэўненасці ў сабе і непаўнавартаснасці. Але варта іншым засумнявацца ў яго велічы, як ён тут жа пачынае злавацца і абараняцца. Упэўнены ў сабе чалавек любую крытыку ўспрымае спакойна і далёка не ўсё прымае на свой рахунак. Ён ведае, што колькі людзей, столькі і меркаванняў, не падабацца камусьці — абсалютна нармальна.

### ЯК ПЕРАМАГЧЫ САРАМЛІВАСЦЬ?

Варта адзначыць, няўпэўненасць у сабе — вельмі распаўсюджаная сітуацыя. Сумнявацца ў сабе, апынуўшыся ў новай нязвыклай сітуацыі, — цалкам нармальна. Іншая справа, калі гэта моцна перашкаджае жыць і не дае дасягнуць жаданых мэт. Ёсць некалькі эфектыўных спосабаў пераадолець няўпэўненасць у сабе і сарамлівасць.

**Успомніце сітуацыі, дзе вы адчувалі сябе ўпэўнена.** Абсалютна няўпэўненых у сабе людзей не бывае. Значыць, дастаткова зразумець, у якія моманты вы адчувалі смеласць, і навучыцца актываваць гэты стан. Для гэтага ўспомніце сітуацыю, у якой вы праявілі ўпэўненасць, убачце сябе ў ёй і зрабіце крок у гэты вобраз, у думках злучыцеся з ім. Рабіце гэтае практыкаванне як мага часцей, і з часам стан упэўненасці пачне ўзнікаць аўтаматычна.

**Бярыце на сябе адказнасць у дробязях.** Гаворка ідзе пра побытавыя дробязі, якія вы звычайна «спіхваеце» на кагосьці іншага, таму што ніколі гэтага не рабілі і страшна, што не атрымаецца. Напрыклад, вы не разбіраецеся ў камунальных рахунках, таму іх аплачвае хтосьці іншы. Хоць раз зрабіце гэта самі. Маленькі поспех умацуе адчуванне «я магу, я справіўся!», а яно абавязкова павысіць вашу ўпэўненасць у сабе. Бо цяпер вы ведаеце: «У выпадку чаго я магу гэта зрабіць». Калі ж вы рэгулярна адмаўляецеся ад новага досведу нават у такіх дробязях, тым самым вы праграмуеце сябе: «Я на гэта не здольны».

**Намалюйце сваю няўпэўненасць.** Калі вы не ведаеце, як пераадолець няўпэўненасць у сабе, проста прадстаўце яе ў выглядзе выявы і намалюйце. Так вы зможаце лепш зразумець свой стан і ўбачыць, што стаіць за вашай няўпэўненасцю і сарамлівасцю. Гледзячы на малюнак, спытаеце сябе: «Як я раблю сябе няўпэўненым? Нашто мне гэта? Чаго я спрабую пазбегнуць ці дасягнуць з дапамогай сваёй няўпэўненасці і сарамлівасці?» Змяніце крыху свой малюнак: дадайце ў яго элементы, якія, на ваш погляд, дапамогуць вам адчуць сябе больш упэўнена. Паглядзіце яшчэ раз на свой малюнак і спытайце сябе: «Што мне зрабіць, каб гэтая энергія ўпэўненасці выявілася ў маім жыцці?» Выпішыце ўсё, што прыходзіць у галаву, і зрабіце гэта хуткім часам.

**Выходзьце з зоны камфорту.** Майце зносіны з рознымі людзьмі. Для таго каб развіць навык зносін, важна пастаянна практыкавацца. Пачніце наведваць мерапрыемствы, знаёмцеся з новымі людзьмі. Майце зносіны з суседзямі, з людзьмі ў чарзе ў краме, з калегамі за абедам. Паступова вам стане лягчэй заводзіць размову, вы перастанеце адчуваць дыскамфорт.

У пошуку рашэння, як пазбавіцца ад няўпэўненасці ў сабе, вы можаце лепш пазнаёміцца са сваім унутраным светам і навучыцца выкарыстоўваць усе свае якасці сабе на карысць. У любым выпадку галоўнае — памятаць: вы — гэта не вашыя дасягненні ці правалы. Кожны памыляецца, і вам па сілах ператварыць гэтыя памылкі ў бясцэнны досвед. Магчыма, менавіта так вы знойдзеце свой адказ на пытанне «Як перамагчы страх і няўпэўненасць у сабе?»

Да ведама бацькоў

# ЯК КУРЫЦА ЛАПАЙ

## Каму пагражае дысграфія і як з ёй змагацца?

**Калі першакласнік піша як курыца лапай, гэта многімі бацькамі ўспрымаецца спакойна — ён яшчэ толькі вучыцца! Калі малы ў першы год вучобы няўпэўнена складае літары ў склады, бацькі не панікуюць. Аднак калі такая сітуацыя працягваецца і ў 2, і ў 3 класе, і нават у сярэдняй школе, тут ужо пачынаюцца праблемы. Спецыялісты ж спісваюць праблемы з напісаннем і блытаннем літар на дастаткова распаўсюджаныя сёння неўралагічныя станы. Адзін з самых распаўсюджаных — «дысграфія». Што хаваецца пад такім паняццем і як дапамагчы дзіцяці, расказала настаўнік-лагапед 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Вольга СЯМАШКА.**

Парушэнні пісьмовай мовы, нараўне з парушэннямі вуснай гаворкі, патрабуюць вялікай увагі, як у школе, так і дома. З пачаткам навучання ў школе ў некаторых дзяцей выяўляюцца праблемы з чытаннем і пісьмом. Дзіця піша непрыгожа, з памылкамі, можа блытаць літары, перастаўляць склады ў слове. У выніку ўзнікаюць спецыфічныя цяжкасці пісьма, якія сведчаць аб наяўнасці ў дзіцяці дысграфіі. Што ж гэта такое? Гэта ўстойлівыя парушэнні пісьма, не звязаныя з няведаннем граматычных правіл.

— Пры дысграфіі дзеці малодшага школьнага ўзросту з цяжкасцю авалодваюць пісьмом: выкананыя імі практыкаванні і дыктоўкі змяшчаюць мноства граматычных памылак. Яны не выкарыстоўваюць загалоўныя літары, знакі прыпынку, у іх «бруднае» пісьмо, — тлумачыць Вольга Сямашка.

Таму пажадана, каб яшчэ да пачатку школьнага навучання дзіця добра разбіралася ў гуках і літарах, з якіх складаюцца словы, валодала правільнай мовай, добра арыентавалася ў прасторы, кіравала сваімі паводзінамі.

Як адзначаюць урачы, верагоднасць развіцця дысграфіі часцей за ўсё закладваецца яшчэ ўнутрыўтробна, а таксама ў родах і першыя месяцы жыцця дзіцяці. Першаснымі прычынамі дысграфіі могуць быць ускладненае праходжанне цяжарнасці, радавыя траўмы, захворванне ў раннім дзяцінстве, асабліва ў першы год жыцця.

Маюцца і перадумовы дысграфіі, якія садзейнічаюць яе ўзнікненню. Напрыклад, няправільнае вымаўленне гукаў: атрымліваецца, піша так, як кажа («вышка» замест «лыжка» або «лакавіна» замест «ракавіна»).

— А бывае і так, што фізічны слых добры і ўсе гукі ў поўным парадку, але чуе дзіця іх па-свойму. Напрыклад, дрэнна адрознівае гукі блізкія па гучанні: і вось ужо «кара» ператварылася ў «пару». Бывае, што дзіцяці складана вылучыць асобны гук, вызначыць яго месца ў слове або парадак складоў: і ў выніку «аранвыжа», а трэба «аранжавы», — прыводзіць прыклады лагапед.

### Гаварыце выразна

Цікава, што з пункту гледжання сацыяльных фактараў на развіццё гаворкі і пісьма малога ўплываюць невыразная гаворка навакольных. Калі ўдакладніць, бабулі і дзядулі, магчыма, таксама рабілі «дурныя» памылкі. І яны маглі перадаць не само парушэнне, а яго перадумовы.

— Важна зразумець, што для авалодання чытаннем і пісьмом важная ступень сфарміраванасці ўсіх бакоў маўлення. Таму парушэнне або затрымка ў развіцці фанематычнага ўспрымання (умення адрозніваць на слых гукі маўлення), лексіка-граматычных бакоў (актыўны і пасіўны слоўнікавы запас), гукавымаўлення на розных этапах з'яўляюцца асноўнымі прычынамі дысграфіі, — расказвае Вольга Сямашка.

Дапаможа справіцца з праблемай такі спецыяліст, як лагапед. Таксама дадаткова трэба прайсці абследаванне ў псіхолага. Гэта дазволіць дастаткова эфектыўна і хутка скарэкціраваць вынік і выправіць становішча. Методыкі, якія дазваляюць выправіць сітуацыю, сёння ёсць, і працуюць яны дастаткова паспяхова. Прычым чым раней будзе пачата лячэнне, тым хутчэй з'явіцца вынік.

### Папярэдзіць праблему

Аднак можна і папярэдзіць парушэнне працэсу пісьма. Трэба не прапусціць абследаванне ў лагапеда ў паліклініцы ці дзіцячым садку, на якім спецыялісты ўбачаць перадумовы магчымых парушэнняў пісьмовай і вуснай мовы.

**Каб такіх праблем не ўзнікла, існуе ранняя прафілактыка:**

• Развіццё фанематычнага слыху. Фанематычны слых — адзін са складнікаў гатоўнасці малога да навучання чытанню і пісьму. Дзіця павінна ўмець адрозніваць звонкія і глухія, мяккія і цвёрдыя гукі. Гэтак жа ўмець дзяліць словы на склады, распазнаваць словы, якія адрозніваюцца адным гукам, вызначаць месца зададзенага гуку ў слове.

• Развіццё арыенціроўкі ў прасторы. Неабходна садзейнічаць развіццю арыенціроўкі дзіцяці ва ўласным целе, паколькі менавіта ў залежнасці ад выдзялення левай і правай рукі ў далейшым у яго фарміруецца ўяўленне аб левым і правым баках прасторы. Дзе б вы ні знаходзіліся (у пакоі, на вуліцы, у краме), прапануйце дзіцяці вызначыць становішча прадметаў адносна яго самога: што знаходзіцца справа, злева ад яго, наперадзе, ззаду.

• Абагачэнне слоўнікавага запасу. Тут таксама неабходны спецыяльны і пастаянны клопат дарослых людзей, якія акружаюць дзіця. Для паўнавартаснага фарміравання граматычнага ладу маўлення вельмі важна спецыяльна практыкавацца яго ў правільным ужыванні асобных граматычных формаў і ў правільнай пабудове фраз.

Зразумела, факт захавання ўсіх гэтых правіл не зможа імгненна выкараніць усе маўленчыя праблемы дзіцяці, але істотна аблегчыць яму жыццё, дапаможа пры навучанні і створыць усе перадумовы да ліквідацыі дэфекту.

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# РАСОНЫ, КЛЯСЦІЦЫ...

На XXX Дні беларускага пісьменства, які праходзіў сёлета ў Гарадку, былі разгорнуты невялікія маштабамі, але вельмі насычаныя кніжныя экспазіцыі, падрыхтаваныя абласнымі бібліятэкамі краіны. Асабліва мяне ўразілі палічкі, якія сабрала Віцебская абласная бібліятэка... І ў шэрагу прадстаўленых ёю кніг — краязнаўчы альманах «Віцебскі край». За гады сабралася цэлая бібліятэка выданняў, без якіх не абысціся ў вывучэнні гісторыі роднай старонкі. А Віцебшчына і сапраўды — надзіва багаты падзеямі і знакамітымі ўраджэнцамі край...



Клясціцы. Помнік героям вайны 1812 г. Пачатак XX ст.

Вось і Расоны, Расонскі раён, яго паселішчы таксама ўражваюць багатай гістарычнай памяццю. Узіраючыся ў паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава, можна выправіцца ў падарожжа і ў самі Расоны, і ў мястэчка пачатку XX стагоддзя Клясціцы, і ў Межава 1920-х гадоў, а таксама ў Сівошына з помнікам Я. П. Кульневу... А яшчэ ў зборах Уладзіміра Аляксеевіча ёсць паштоўкі з рэпрадукцыямі карцін, якія ўзнаўляюць бітву вайны 1812 года каля Клясціц... Імчаць у атаку ліхія гусары Якава Кульнева, сышліся ў штыкавым баі французскія і рускія салдаты...



Расоны. Мясцовыя жыхары. Пачатак XX ст.

Першае пісьмовае ўпамінанне пра Расоны адносіцца да 1552 года («Полацкая рэвізія»). Вядома, што паселішча знаходзілася ў валоданні Ф. Корсака, налічвала сем дымоў. Відаць, трэба растлумачыць, што лічылася ў даўнія стагоддзі дымам... Гэта — адзінка падатка абкладання. У дым уваходзіла сялянская гаспадарка з зямлёй, пабудовамі, жывёлай, гаспадарскім рыштункам, начыннем. Члены сям'і павінны былі выконваць на карысць феадала розныя павіннасці — службу. Пасля аграрнай рэформы XVI — першай паловы XVII стагоддзя асноўнымі аб'ектамі падаткаабкладання былі ўжо валока і служба. Дым пачаў атаясамлівацца з паняццем дома, двара.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе Расоны ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. У канцы XIX стагоддзя ў Расонах працавалі дзве царквы. Былі дзве навучальныя ўстановы: агульнаадукацыйная прыватная жаночая гімназія (з 1866 года) і мужчынская вучылішча (заснавана ў 1869 годзе). Сваю пячатку на жыццё ў Расонах накладвала і карчма. У 1905 годзе вёска Расоны ўвайшла ў склад Вазнясенскай воласці Полацкага павета...



Межава. 1920-я гг.

Мы згадвалі Клясціцы, якія знаходзяцца ад сённяшняга гарадскога пасёлка Расоны за 16 кіламетраў. Помнік у гонар перамогі расійскіх войскаў у Клясціцкіх баях 1812 года не захаваўся. Яго можна разгледзець на адной з паштовак... Ён быў устаноўлены ў 1857 годзе па мадэлі архітэктара Антонія Адаміні. Уяўляў з сябе востраканцовую васьмібаковую піраміду з купалам і пазалочаным крыжам. У 1930-я гады помнік разбурылі. У 1962 годзе прыкладна на тым самым месцы, дзе знаходзіўся старадаўні манумент, устанавілі «Помнік у гонар перамогі рускіх войскаў», які ў 1992 годзе дэманціравалі... Гісторыя помнікаў, іх лёсы — гісторыя Айчыны... Бітва пад Клясціцамі лічыцца малавядомай падзеяй вайны 1812 года. А між тым трохдзённы бой паміж французамі і асобным корпусам рускай арміі на Пецярбургскім напрамку каля вёскі Клясціцы на дарозе паміж Полацкам і Себежам паспрыяў таму, што захопнікі спынілі прасоўванне на Пецярбург. Маршал Удзіно адступіў за Заходнюю Дзвіну, пакінуўшы за сабою ўмацаваны Полацк. І яшчэ, служачыся дзеянняў рускіх войскаў на чале з генералам Вітгенштэйнам, імператар Напалеон аслабіў галоўную групоўку войскаў і паслаў на дапамогу Удзіно корпус генерала Сен-Сіра. Страты французаў забітымі і паранеными склалі 10 тысяч чалавек, у палон былі ўзятыя тры тысячы... Імператар Аляксандр І назваў Вітгенштэйна выратавальнікам Пецярбурга, узнагародзіў яго ордэнам Святога Георгія II ступені. Ад народа генерал Вітгенштэйн атрымаў званне «абаронцы Пятрова горада».



Расоны. 1930-я гг.

Расонскі край — і цікавая гісторыя іншых паселішчаў. У вёсцы Мурагі нарадзіўся легендарны Ян Баршчэўскі (1794, паводле іншых крыніц, 1790, 1796 ці 1799 — 1851), аўтар твора «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Падзеі фантастычных апавяданняў Я. Баршчэўскага даволі часта адбываюцца ў канкрэтных мясцінах: у вёсках Юхавічы, Краснопаль, на рэках Дрыса, Палата, Дзвіна. На Віцебшчыне памятаюць пісьменніка, прысвячаюць яму розныя канферэнцыі. Вёска Тройдавічы — радзіма паэта Генадзя Бураўкіна (1936 — 2014; нарадзіўся ў вёсцы Шуляціна, якая цяпер носіць назву Тройдавічы). Вучыўся паэт у Расонскай школе да восьмага класа. Пасля бацькі пераехалі ў Полацк. З успамінаў пісьменніка пра ваеннае дзяцінства: «Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, мне было пяць гадоў. Бацька пайшоў на фронт, а маці засталася з намі. Страх за дзяцей, трывожная насцярожанасць, калі паблізу хаты з'яўляліся паліцаі, голад, нястачы... Самае страшнае было наперадзе, калі зімой 1943 года ў вёску прыйшлі карнікі, помсцячы сем'ям партызан і ўсім вяскоўцам. Карнікі выгналі людзей з хат, выстраілі перад кулямётамі і доўга трымалі на холадзе. Мы стаялі на ўзгорку трыма радамі: першы рад мужчыны і дзяды, другі — заплаканыя жанчыны з малымі на руках і трэці — мы, каму шэсць-дзесяць — дванаццаць гадоў. На нас быў нацэлены кулямёт. Мы чакалі стрэлаў. Плачуць жанчыны, маўчаць дзяды. А стрэлаў усё няма. Пад вечар нас сагналі ў лазню на ўскрайку вёскі. Было цёмна і цесна. Для малых адвялі палок, мы сагрэліся на ім і пачалі валтузню, а маці нашы плакалі і чамусьці пачалі абдымацца. Я тады не ведаў, што дзверы лазні забіты цвікамі, што лазня абкладзена саломай і паліцаі пайшлі шукаць бензін. Я тады многае не разумеў. Шчаслівы выпадак выратаваў людзей. Я не памятаю твару таго, хто вызваліў нас. Памятаю толькі, што гэта быў стары немец-салдат. Ён не ўмеў гаварыць па-руску і ўсё махаў рукамі ў бок лесу. Мы ўсе ўцяклі і выратаваліся...» Тэма Вялікай Айчыннай вайны заняла адно з найважнейшых месцаў у паэзіі і публіцыстыцы Генадзя Бураўкіна.



Помнік Я. П. Кульневу. Сівошына. Пачатак XX ст.

Расонскі край багаты не толькі на пісьменніцкія таленты... У вёсцы Матылёва нарадзіўся Герой Сацыялістычнай Працы Барыс Голубеў, які працаваў машыністам па нарыхтоўцы фрэзернага торфу ў Смалявіцкім раёне. Легендарная асоба — Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня калгаса, звенняная льнаводчага звяна Ганна Гарэцкая (1900 — 1980), якая нарадзілася ў вёсцы Варацюгі. Ганна Савелеўна ўсё жыццё адпрацавала ў калгасе «Расоны», у час Вялікай Айчыннай вайны была ў партызанах. Ураджэнец вёскі Пушча — Герой Савецкага Саюза маёр авіяцыі Сцяпан Іванавіч Жукаў (1923 — 1997). Сярод баявых узнагарод мужнага лётчыка — ордэн Леніна, тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэны Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, Славы III ступені. На хутары на Расоншчыне нарадзілася легендарная франтавая медсястра, якая была цяжка параненая, на полі бою атрымала абмаражэнне, пасля пазбавілася рук і ног, — Герой Савецкага Саюза Зінаіда Тусналобава-Марчанка (1920 — 1960). З Забор'я — Герой Савецкага Саюза камандзір артылерыйскай батарэі Аляксандр Кірылавіч Шэлепень (1918 — 1964)... Такіх легендарных асоб выпеставаў Расонскі край, у віртуальнае падарожжа па якім з паштоўкамі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава мы вас і запрашаем.



Клясціцы. Від на мястэчка ад возера. Пачатак XX ст.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**
**Паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**

## ОАО «Амкодор-Унимод»,

*220073, г. Минск, ул. Пинская, 18*

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится **18 сентября 2023 г. в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал общества.

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «Амкодор-Унимод».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня:**

